ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
4 МАЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 83 (28447)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як выбраць ВНУ сваёй мары?



Саўндтрэк да жыцця



Незвычайныя калекцыі беларусаў
СТАР. 16

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Чыноўнікі сталі часцей напрамую камунікаваць з людзьмі, гэта спрыяе вырашэнню многіх пытанняў. Павінна быць рэальная сувязь. Такія сустрэчы з людзьмі вельмі важныя, ты атрымліваеш зваротную сувязь і разумееш, наколькі якасна выконваюцца на месцах заканадаўчыя акты. Наша задача, каб грамадзян пачулі, а праблему вырашылі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8716 | ▲ |
| Еўра | 2,0421 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0706 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
17083>

■ Медыяпрастора

# ДОБРЫ ЧАС ДЛЯ ЗНАЁМСТВА І ПАРАЗУМЕННЯ

## У выставачным павільёне на праспекце Пераможцаў, 14 адкрылася выстаўка «СМІ ў Беларусі»

**Учора распачала сваю працу XXI Міжнародная выстаўка «СМІ ў Беларусі». Па традыцыі ўдзел у ёй прынялі не толькі цэнтральныя газеты, часопісы, тэлеканалы і радыёстанцыі, але таксама і прадстаўнікі рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі — усяго каля 100 удзельнікаў. Таксама тут можна азнаёміцца з выданнямі, якія ствараюцца ў беларускіх дыяспарах у Літве, Латвіі, Украіне і Расіі.**

Ва ўрачыстым адкрыцці выстаўкі прынялі ўдзел шматлікія шаноўныя госці. Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль Жарко зачытаў прывітанне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі да ўдзельнікаў, гасцей і арганізатараў выстаўкі. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй Цымін адзначыў, што беларуская выстаўка надзвычайна папулярная ў прадстаўнікоў кітайскіх медыя. Старшыня Асацыяцыі нацыянальных інфармацыйных агенцтваў краін Прычарнамор'я, генеральны дырэктар Балгарскага тэлеграфнага агенцтва Максім Мінчаў заклікаў журналістаў заставацца вернымі сваёй прафесіі і павіншаваў са святам, Днём друку, якое ў Беларусі будзе адзначацца 5 мая.
СТАР. 3





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



■ Рынак жылля

# КВАДРАТ ПАТАННЕЕ І... БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ?

## Эксперты па сталічнай нерухомасці прагназуюць, што да сярэдзіны лета кватэры на другасным рынку Мінска страцяць яшчэ да 2 працэнтаў свайго кошту ў валюце

**Аналітыкі жыллёвай сферы адзначаюць, што гэтай вясной у найбуйнейшым мегаполісе краіны назіраюцца прыкметы стабілізацыі як па колькасці саміх здзелак, так і па цэнах на кватэры. Агульная абстаноўка на рынку спакойная, але існуюць нюансы. Каб прафесійна ацаніць сітуацыю на мінскім рынку жылля і скласці прагноз на найбліжэйшы час, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з вядомым экспертам у сферы жыллёвай нерухомасці — старшынёй савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» (БелАН) Мікалаем ПРАСТАЛУПАВЫМ.**

### Тэндэнцыя сезоннасці

Звычайна з надыходам вясны попыт на кватэры стабілізуецца пасля сезоннага спаду ў снежні і лютым. Сёлета нармальная пакупніцкая актыўнасць назіралася ўжо ў лютым, а ў сакавіку колькасць заключаных здзелак перавысіла максімум для гэтага месяца за апошнія 10 гадоў. Атрымліваецца, што «на нізкім старце» гэтай зімой знаходзілася нямала патэнцыйных пакупнікоў. Колькасць здзелак куплі-продажу павялічылася ў параўнанні з лютым на 32,5% і перавысіла круглую адзнаку ў 1200 прададзеных кватэр.

Сярэднія цэны здзелак са стандартнымі кватэрамі засталіся амаль на ўзроўні лютага, калі канчатковы цэннік аднапакаёвак быў на ўзроўні 1120 долараў за квадратны метр, для двухпакаёвак — 1030 долараў, а для трохпакаёвых кватэр 980 долараў. У асобных выпадках прадаўцы згаджаліся і на больш істотныя зніжкі, але на агульную сітуацыю гэта не паўплывала.

### Маленькія аднапакаёўкі — каля 33 тысяч долараў

Зразумела, што гэта мінімальны кошт самых слабенькіх і малых па плошчы аднапакаёвых кватэр. Па такім цэнніку прапануюцца кватэры з агульнай плошчай да 35 квадратных метраў у старых пяціпавярховых дамах на крайніх паверхах. Крыху лепшае жыллё ў стандартных дзевяціпавярховых панэльных выстаўляецца на продаж ужо за 40—45 тысяч долараў. Сапраўды прасторныя аднапакаёўкі з палепшанай планіроўкай у дастаткова маладых дамах спальных раёнаў могуць прапаноўвацца нават і цяпер па цане да 60 тысяч долараў.

Самыя танныя двухпакаёвыя кватэры маюць цэннік ад 40 да 42 тысяч долараў. Плошча такога бюджэтнага жылля звычайна складае ад 40 да 45 квадратных метраў. Кватэры гэтага цэнавога ўзроўню будуць абавязкова мець вельмі маленькую кухню (да 5,5 «квадрата») і прапіску ў не самым лепшым раёне сталіцы, напрыклад у Заводскім ці Шабанах. Стандартныя двухпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай да 50—55 квадратных метраў прапануюцца цяпер за 48—57 тысяч долараў. Сучасныя двухпакаёўкі з прасторнымі кухнямі і агульнай плошчай да 70 квадратных метраў выстаўляюцца на продаж ужо па цане ад 65 да 75 тысяч долараў і нават даражэй.

Мінімальны попыт назіраецца сёння на трохпакаёвыя і шматпакаёвыя кватэры. Таму яны і таннеюць хутчэй. У старых дамах на крайніх паверхах сёння магчыма набыць такую трохпакаёўку плошчай да 55—58 квадратных метраў па цэнніку ў межах ад 46 да 53 тысяч долараў.
СТАР. 4

# «Сілы шукаем у перамозе»

**Учора ў Палацы Рэспублікі Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, уручыў дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны, якіх у зале сабралася амаль сотня. Гэта сацыяльныя работнікі, дактары, выкладчыкі, навукоўцы, работнікі прамысловасці, лясной галіны, аграрыі, будаўнікі, нафтавікі, прадстаўнікі падатковых органаў, творчая інтэлігенцыя, дзяржаўныя служачыя.**

Сярод узнагароджаных прысутнічала вялікая група медыцынскіх работнікаў. Па словах беларускага прэм'ера, у апошнія гады айчынная ахова здароўя значна прасунулася наперад. «Сёння ў краіне нараджальнасць перавышае смяротнасць. Патэнцыял айчыннай медыцыны значны. І зараз пастаўлена задача выкарыстоўваць яго ў поўнай меры, у прыватнасці неабходна нарошчваць аб'ёмы экспарту медыцынскіх паслуг», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Ён нагадаў, што толькі ў гэтым годзе перад галіной стаіць задача атрымаць не менш як 40 мільёнаў долараў ад экспарту паслуг.

Падзякі Прэзідэнта былі ўручаны і групе работнікаў прафсаюзаў. Андрэй Кабякоў адзначыў такія ініцыятывы арганізацыі, як прапанова аб узмацненні абароны правоў работнікаў, што працуюць па кантракце, заканадаўчае ўзмацненне адказнасці наймальніка за выкананне абавязацельстваў перад работнікамі. **Аляксандр МІКША, намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі,** адзін з узнагароджаных. На яго думку, сёння беларускія прафсаюзы напрамую вырашаюць пытанні, якія датычацца правоў працоўных. «Калі зірнуць на прафсаюзы іншых краін, то там іх колькасць невялікая: 7—10% ад эканамічна актыўнага насельніцтва, у нас — 96%, а гэта амаль усё працаздольнае насельніцтва. У іншых краінах адбываецца наступленне транснацыянальных кампаній,назіраецца зніжэнне прафсаюзнага членства. Але ў Беларусі прафесійныя саюзы сваіх пазіцый не губляюць», — сказаў ён.

**Ліліяна АНЦУХ, дырэктар і галоўны рэдактар выдавецтва «Чатыры чвэрці», член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі,** атрымала з рук прэм'ер-міністра медаль Францыска Скарыны. Карэспандэнт «Звязды» запытала яе, што трэба зрабіць, каб у нашай краіне з'явіліся шэдэўры, роўныя «Вайне і міру». «Эканамічныя ўмовы былі розныя ў розныя часы. Але гэта не ўплывала на колькасць створаных шэдэўраў. Тут адваротная залежнасць: культура стварае той фундамент, на якім вырастае ўсё астатняе, у тым ліку эканамічныя поспехі», — адказала кіраўнік выдавецтва.

Андрэй Кабякоў адзначыў, што цырымонія ўзнагароджвання сімвалічна праходзіць напярэдадні Дня Перамогі. «Таму завяршыць свой выступ хацеў бы словамі маршала СССР Георгія Жукава: «Час не мае ўлады над веліччу ўсяго, што мы перажылі ў вайну, а народ, які перажыў аднойчы вялікія выпрабаванні, будзе і надалей чэрпаць сілы ў гэтай перамозе», — падкрэсліў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении 22 мая 2017 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)** | «Изолированное помещение (квартира №16) с инвентарным номером 500/D-12418, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 10-16, площадь 73,4 кв. м, год постройки – 2003» (назначение: квартира, число комнат: 2) |
| **Начальная цена** | 133 200,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 13 300,00 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 22 мая 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 04.05.2017 по 18.05.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»


■ Тры пытанні да ўлады

# КАБ БЫЛО ЎТУЛЬНА СВАІМ І ПРЫЕЗДЖЫМ

## Патэнцыял Астравеччыны — у моладзі і аб'ектах нерухомасці

**Сучасная Астравеччына лічыцца самым перспектыўным рэгіёнам Гродзенскай вобласці. Дзякуючы будаўніцтву атамнай электрастанцыі апошнія некалькі гадоў тут як на дражджах «растуць» садкі, школы, паліклінікі і жылыя дамы. Робіцца больш разнастайнай сетка турыстычных паслуг, што ў сваю чаргу спрыяе развіццю малога бізнесу. А далучэнне горада ў 2015 годзе да праекта Сусветнай арганізацыі аховы здароўя «Здаровыя гарады» мае на мэце выхаваць пакаленне людзей са здаровым поглядам на жыццё. Чым цяпер жыве горад і што плануе рабіць у найбліжэйшы час, расказаў старшыня Астравецкага райвыканкама Ігар ШАЛУДЗІН.**



***— Ігар Яраслававіч, на пасадзе старшыні вы толькі некалькі месяцаў, але ж, пэўна, пакрысе асвойваецеся ў горадзе атамшчыкаў, унікаеце ў дробязі. Як праект «Здаровыя гарады» рэалізуецца на Астравеччыне, і што робіцца для стварэння здароўезберагальнага асяроддзя?***

— Гэты праект, па сутнасці, не матэрыяльны, ён не арыентаваны на вытворчасць. Яго галоўная задача, на маю думку, — выгадаваць здаровае будучае пакаленне. Менавіта яго дасягненні і стварэнні, заснаваныя на здаровых прынцыпах, стануць тымі вытворчымі дабротамі, якія мы атрымаем у будучыні. Акрамя таго, яшчэ адна задача для нашчадкаў — павысіць колькасць насельніцтва. На прыкладзе нашага раёна відаць, што за нейкія 16 гадоў (з 2001-га) з 28,8 тысячы людзей у нас засталося 23,7 тысячы. Разам з тым у Беларусі магло б пракарміцца ўдвая і ўтрая больш людзей, чым жыве цяпер, і кожны з іх, у сваю чаргу, таксама ствараў бы нейкія даброты і прыносіў карысць. У выніку мы былі б значна багацейшымі як нацыя і краіна.

Калі казаць пра дакладныя чаканыя вынікі праекта, то, прапагандуючы здаровы лад жыцця і спрабуючы перабудаваць менталітэт беларуса, мы спадзяёмся на рост колькасці людзей, што далучацца да ідэі здаровага жыцця, на 10—15%. Працоўныя страты ад часовай непрацаздольнасці, мяркуецца, знізяцца на 10%, а асоб, што адмовяцца ад злоўжывання алкаголем і цыгарэтамі, паменшае на 5%. За 2016 год ужо скараціліся паказчыкі захваральнасці дзяцей ад нараджэння да 17 гадоў. Пры гэтым, праўда, выявілася праблема захворванняў у малых органаў дыхання — ад іх пакутуе 65,4% дзетак.

Тэматычныя мерапрыемствы ў межах праекта рэалізуюцца пастаянна. З 2015-га ў школах кожная другая субота штомесяц праходзіць пад знакам здароўя. Трэці год працуе клуб «Актыўнае даўгалецце», які аб'ядноўвае людзей «залатога» ўзросту. У 2016-м распачаты праект «Два жыцці», скіраваны на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў раёне. Гэта прафілактычная работа з падлеткамі і моладдзю па захаванні іх рэпрадуктыўнага здароўя і прапаганда каштоўнасцяў сям'і і дзяцінства. Летась прайшоў тыдзень здароўя са штодзённымі акцыямі: абучэннем скандынаўскай хадзе сталых людзей, абменам цыгарэт на яблыкі, велапрабегам і іншымі творчымі і натхняльнымі ініцыятывамі.

***— Астравецкая атамная электрастанцыя, безумоўна, — самы знакавы будаўнічы аб'ект краіны за апошні час. Які ўплыў будоўля аказвае на горад, яго эканамічнае і сацыяльнае жыццё?***

— Мы можам сёння пахваліцца адным з самых нізкіх узроўняў беспрацоўя. Зразумела, гэта адбываецца перш за ўсё праз будаўніцтва АЭС і адпаведнай інфраструктуры для яе абслугоўвання. За час рэалізацыі дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы з 2011 года ўзведзена 15 аб'ектаў: адміністрацыйныя будынкі, інжынерныя сеткі, дарогі, жыллё, дзіцячы садок, школа.

2017-ы таксама прынясе з сабой новыя аб'екты. Да першага верасня з'явіцца другі новы дзіцячы сад, а летам пачнуць узводзіць трэці, распачата будаўніцтва трэцяга жылога мікрараёна. Пачаў дзейнічаць гарадок унутраных войскаў па ахове АЭС, а летам у вёсцы Буйкі ўвядуць у дзеянне комплекс пагранзаставы Астравецкая. Рэалізоўваецца праект па электрыфікацыі чыгункі на напрамку ад Маладзечна да мяжы з Літвой.

У 2018-м будзе пабудаваны комплекс цэнтральнай раённай бальніцы з сучасным абсталяваннем, адчыніць дзверы фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнамі, лазнямі, трэнажорамі, пачнецца рэканструкцыя, а фактычна — будаўніцтва стадыёна, з'явіцца ваенны гарадок Варняны для аховы АЭС.

Усё гэта нясе ў сабе перспектывы для камфортнага і здаровага жыцця і спрыяе вяртанню ў горад моладзі. У 2015-м у Астравец прыехала 190 маладых спецыялістаў, а летась — ужо 235, больш за 80 з якіх — ураджэнцы краю. Маладым ёсць дзе працаваць і адпачываць, і амаль 70% з іх застаецца тут жыць пасля адпрацоўкі па размеркаванні.

***— У межах прамысловага турызму пляцоўку будоўлі АЭС наведала ўжо больш за 100 турыстычных груп з усяго свету. Якія ўмовы створаны ў горадзе і наваколлі, каб заахвоціць турыстаў працягнуць наведванне?***

— Экскурсіі на будаўнічую пляцоўку станцыі ўжо скончыліся, аднак раёну ёсць што прапанаваць турыстам. Акрамя вандровак па жывапісных мясцінах, можна наведаць храмы і помнікі архітэктуры ў самім Астраўцы і за яго межамі. Цікаўныя могуць адправіцца ў падарожжа па водна-веласіпедных, веласіпедных і пешых маршрутах: «Астравеччына — край блакітных азёр», «Гісторыя, застылая ў камені», прайсці па экалагічнай сцежцы «У Альбекаў».

У раёне працуе 16 аграэкасядзіб і 14 рамеснікаў. У 2011 годзе было 329 адзінак прыватнага бізнесу: і прадпрымальнікаў, і малых арганізацый, а на пачатак 2017-га іх ужо 560. Аднак разам з галіной вытворчасці трэба развіваць і сферу паслуг.

Упэўнены, што ёсць патэнцыял і ў аб'ектаў нерухомасці горада і раёна, якімі цяпер не карыстаюцца. Акрамя таго, у краі засталося шмат прыгожых і цікавых маёнткаў. Шмат што з гэтага можна аднавіць і выкарыстоўваць як турыстычныя аб'екты. Гэта спрыяльная асяродак для развіцця прадпрымальніцтва і ўкладвання грошай. Інвестары цікавяцца нашым кутком, і мы гатовыя іх прыняць.

Шмат працы ў краі, і задумак таксама мноства. Будзем пакрысе рэалізоўваць. Хочацца, каб рай быў прывабным і ўтульным для сваіх людзей і для прыезджых.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Распушчаны парламент Вялікабрытаніі

Парламент Вялікабрытаніі распушчаны 3 мая напярэдадні датэрміновых усеагульных выбараў. Заканадаўчы орган Злучанага Каралеўства спыніў сваю работу ў 00.01 па мясцовым часе.

Згодна з дзеючым у Вялікабрытаніі заканадаўствам, парламент павінен быць распушчаны за 25 рабочых дзён да правядзення ўсеагульных выбараў, якія па ініцыятыве прэм'ер-міністра Тэрэзы Мэй павінны прайсці 8 чэрвеня. Брытанскі прэм'ер сустрэнецца з каралевай Лізаветай ІІ, каб узгадніць з ёй пытанне роспуску Вестмінстэра, аднак гэтая працэдура будзе насіць фармальны характар.

Роспуск парламента Вялікабрытаніі аўтаматычна азначае, што ўсе 650 месцаў у яго палаце абшчын (ніжняя палата) становяцца свабоднымі. На працягу некалькіх дзён былым дэпутатам дазваляецца прыходзіць у будынак Вестмінстэрскага палаца, каб забраць дакументы і асабістыя рэчы. Члены невыбранай палаты лордаў (верхняя палата) парламента захоўваюць за сабой свае месцы і доступ у парламент, аднак пасяджэнні не праводзяць.

## СМІ даведаліся аб «адсутнасці прарыву» пры размове Пуціна і Трампа

Тэлефонная размова, якая адбылася 2 мая паміж прэзідэнтамі ЗША і Расіі Дональдам Трампам і Уладзімірам Пуціным, не прывяла да прарыву. Пра гэта паведаміла The Wall Street Journal са спасылкай на неназванага амерыканскага чыноўніка.

Паводле яго слоў, размова па тэлефоне доўжылася каля 30 хвілін і была ініцыявана Пуціным. Акрамя таго, як адзначыў суразмоўца выдання, канкрэтных дамоўленасцяў пра асабістую сустрэчу двух прэзідэнтаў на саміце G20 у ліпені ў ходзе размовы таксама не дасягнута.

Гаворачы аб выніках праведзенай тэлефоннай размовы, Крэмль заявіў, што лідары абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва Расіі і ЗША ў барацьбе з тэрарызмам у Сірыі.

Белы дом, у сваю чаргу, назваў размову двух прэзідэнтаў «вельмі добрай». «Прэзідэнт Трамп і прэзідэнт Пуцін пагадзіліся з тым, што канфлікт у Сірыі працягваецца занадта доўга і што ўсе бакі павінны зрабіць усё магчымае, каб пакласці канец насіллю», — гаварылася ў паведамленні Белага дома.

## У Бразіліі супрацоўнікі турмаў занялі будынак мінюста, пратэстуючы супраць пенсійнай рэформы



Згодна з законапраектам, які прапанаваў прэзідэнт краіны Мішэл Тэмер, прапануецца ўстанавіць мінімальны ўзрост для выхаду на пенсію на ўзроўні 65 гадоў для мужчын і 62 — для жанчын.

Мітынгоўцы разбілі ўваходныя дзверы ва ўстанове. Яны патрабуюць, каб парламент уключыў у законапраект пункт аб ільготах пры выхадзе на пенсію для тых, хто працуе ў турмах найбуйнейшай паўднёваамерыканскай краіны.

**Неспрыяльныя дні і гадзіны ў маі**

| | |
|---|---|
| 4, чацвер, 6.30 – 12.00 | 21, нядзеля, 4.30 – 12.00 |
| 6, субота, 14.30 – 20.30 | 23, аўторак, 9.00 – 14.30 |
| 9, аўторак, 0.00 – 7.00 | 24, серада, 20.30 – 24.00 |
| 10, серада, 22.30 – 24.00 | 25, чацвер, 0.00 – 15.00 |
| 11, чацвер, 0.00 – 19.00 | 26, пятніца, 3.00 – 16.30 |
| 14, нядзеля, 4.00 – 7.30 | 27, субота, 8.30 – 13.30 |
| 16, аўторак, 12.30 – 19.30 | 29, панядзелак, 9.00 – 14.00 |
| 19, пятніца, 2.30 – 6.00 | 31, серада, 13.00 – 18.30 |

# ДОБРЫ ЧАС ДЛЯ ЗНАЁМСТВА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адной з цэнтральных падзей першага дня выстаўкі стала канферэнцыя «СМІ ў зменлівым свеце. Прафесіяналізм і адказнасць», арганізаваная Міністэрствам інфармацыі.

— Прафесіяналізм і адказнасць — галоўнае ў прафесіі журналіста, — адзначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Закон рэгламентуе журналісцкую прафесію як вельмі адказную. Даючы карэспандэнту права атрымліваць і распаўсюджваць навіны, ён прадугледжвае і адказнасць за тое слова, якое даносіцца да чытача, слухача і гледача. Варта бачыць не толькі адзін пункт гледжання, але звяртаць увагу на тое, што сёння ў кожным працэсе, з'яве ёсць плюралізм падыходаў, меркаванняў. Калі журналіст не ангажаваны, ён абавязкова павінен улічваць у сваёй працы неабходнасць поўнага паказу ўсёй сітуацыі.

Лілія Ананіч падкрэсліла, што ў Беларусі сёння працуе вялікая колькасць СМІ, узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій дазваляе кожнаму атрымліваць любую цікавую для яго інфармацыю. «Канстытуцыйнае права грамадзян на атрыманне поўнай дакладнай інфармацыі цалкам забяспечваецца», — адзначае міністр.

Сёлетні ганаровы госць выстаўкі СМІ — Кітай. Стэнд гэтай краіны займае ў выставачным павільёне адно з цэнтральных месцаў. Варта адзначыць, што газета «Звязда» ладзіць сумесны праект з кітайскай газетай «Жэньмінь жыбаа». Навіны нашай краіны рэгулярна размяшчаюцца на партале гэтага выдання, у той час як інфармацыя з Паднябеснай адлюстроўваецца на сайце «Звязды» ў рубрыцы «Весткі з Кітая» і часам друкуецца ў папяровым выданні.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй ЦЫМІН** адзначыў:

— Беларусь і Кітай цесна супрацоўнічаюць. Вашы журналісты наведалі нашу краіну, перанялі пэўны вопыт. Таксама і кітайскія карэспандэнты завіталі ў Беларусь — сюды прыехалі больш за 40 журналістаў. Выстаўка «СМІ ў Беларусі» — гэта добрая платформа для знаёмства, наладжвання ўзаемаразумення. Простае насельніцтва Кітая мае вялікую цікавасць да Беларусі: да таго, што ў вас адбываецца, якія маеце эканамічныя, сацыяльныя інтарэсы, таксама хочуць больш даведацца пра вашу культуру і традыцыі. У Кітаі надзвычай цікавяцца і беларускай мовай. Я, як Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі, таксама пачынаю вывучаць мову. Ужо ведаю некаторыя словы, напрыклад назву нашай нацыянальнай стравы па-беларуску — «качка па-пекінску».




На стэндзе «Звязды» гэтымі днямі ёсць што паглядзець і паслухаць. Акрамя прэзентацыі ўласна газеты, нашых літаратурна-мастацкіх выданняў, часопісаў «Вожык» і «Родная прырода», пастаянна адбываецца і шмат іншых цікавінак. На ўрачыстай прэзентацыі «Звязды» на галоўнай сцэне выступіў ансамбль народнай музыкі «Баравічанка», спявак Дзмітрый Качароўскі. Сваім майстэрствам ігры на скрыпцы ўсіх прысутных здзівіла Маймуна (у дуэце з Юзары яна прадстаўляла Беларусь на Еўрабачанні-2015). Да таленавітай прыгажуні выстраілася чарга прыхільнікаў: кожны хацеў атрымаць аўтограф і сфатаграфавацца на памяць.

Удзячныя чытачы пастаянна завітаюць на стэнд Выдавецкага дома. Адзін з іх, **Мікалай САВІК**, расказаў:

— Я чытаю «Звязду», бо яна даволі хораша (пры гэтым аб'ектыўна) падтрымлівае нашу беларускую справу. На старонках вашай газеты я рэгулярна бачу цудоўную рубрыку «Фотаслова», у якой змяшчаюцца вершы і фотаздымкі Яўгена Пясецкага з адметнымі краявідамі Беларусі. Ён адзіны з супрацоўнікаў выдання, чые працы трапілі ў двухтомную анталогію Генадзя Рымскага, выдадзеную ў Маскве ў выдавецтве Літаратурнага інстытута імя Горкага. Таксама я рэгулярна зазіраю ў каляндар спрыяльных і неспрыяльных дзён, які змяшчаецца ў «Звяздзе», — і ён мяне яшчэ ніколі не падводзіў.

Спецыялісты «Белпошты» на выстаўцы СМІ праводзяць акцыю па дабрачыннай падпісцы «Падары дзіцяці радасць». Кожны ахвотны можа аформіць падпіску на дзіцячыя часопісы і газеты на адрас дзяцей і падлеткаў, якіх выхоўваюць у дзіцячых дамах. Для гэтага на выставачным стэндзе «Белпошты» ўсталявана сімвалічнае дрэва дабра. Каб аформіць падпіску, дастаткова выбраць «яблык» з імем дзіцяці і ў адпаведнасці з яго ўзростам падабраць яму перыядычнае выданне.

Выстаўка «СМІ ў Беларусі» будзе працаваць да 6 мая. Не прапусціце цікавінкі, якія прыйдуцца даспадобы менавіта вам.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# ЧАСОПІС ЯК ЛЮСТЭРКА ГРАМАДСТВА

## «Беларуская думка» адзначае 95-годдзе

**Нягледзячы на дастаткова сур'ёзны ўзрост, выданне па-ранейшаму асвятляе найбольш актуальныя аспекты жыццядзейнасці, адлюстроўвае пытанні, якія хваляюць сучаснае грамадства. У аўтарытэтным часопісе друкуюцца вядомыя грамадскія дзеячы і навукоўцы, выступаюць эксперты самых розных сфер.**

Шматгадовыя аўтары «Беларускай думкі» якраз і сабраліся падчас круглага стала, які прайшоў у межах XXI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі». Пагаварылі пра значэнне часопіса ў сучаснай медыясферы, увогуле абмеркавалі ролю сродкаў масавай інфармацыі ў ідэалагічных працэсах дзяржавы.

— Напэўна, няма ў краіне іншага выдання, якое столькі публікацый прысвяціла б пошуку беларускай нацыянальнай ідэі, — лічыць колішні рэдактар часопіса, **дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН**. — «Беларуская думка» развівалася разам з нашай дзяржавай. Сёння гэта кніга па асноўных кірунках гуманітарнай і палітычнай думкі, якая вызначае тэндэнцыі, далейшыя шляхі развіцця.

Як адзначыў **акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук, член-карэспандэнт Аляксандр КАВАЛЕНЯ**, «Беларуская думка» зрабіла вельмі шмат у справе фарміравання гістарычнай свядомасці беларускага грамадства. «Мы стаім на пачатку нацыянальна-дзяржаўнага шляху, і наша духоўная бяспека ў значнай ступені сведчыць аб тым, як народ, як кожная асоба адчуе сябе грамадзянінам незалежнай Беларусі, — перакананы доктар гістарычных навук. — «Беларуская думка» мае непасрэднае дачыненне да фарміравання духоўна-каштоўнаснага вобраза беларуса».

На думку **дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вячаслава ДАНІЛОВІЧА**, няма аналагічных выданняў такога маштабу грамадска-палітычнага і навукова-папулярнага спалучэння.

— Мне хацелася б, каб «Беларуская думка» не была інтэрнэтам на паперы, — адзначыў **галоўны рэдактар часопіса Аляксандр САМОВІЧ**. — У сілу развіцця інфармацыйных тэхналогій і шматлікіх пераваг у IT-сферы вельмі важна сёння мець варыянт, да якога ў любы момант можна вярнуцца. У часопісе друкуецца паліткарэктная, ідэалагічна выверaная інфармацыя, якая суправаджаецца экспертным меркаваннем аўтарытэтнай навуковай супольнасці, спецыялістаў-практыкаў, людзей, якія праявілі сябе як вопытныя кіраўнікі і спецыялісты.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ПАРАД ЛОЎ-КІКАЎ У МІНСКУ

**У сталічным Палацы спорту стартаваў чэмпіянат свету па муай-тай.**

Да гэтага турніру будзе прыкавана асаблівая ўвага МАК, таму што ў снежні 2016 года ён афіцыйна ўключыў тайландскі бокс у спіс прэтэндэнтаў у алімпійскую праграму. Форум вядучых тайбаксёраў працягнецца да 12 мая. У Мінск завіталі прадстаўнікі сямі дзясяткаў краін. За нашу зборную выступіць наймацнейшыя кікбаксёры Беларусі, якія дакладна здольныя паднясца на п'едэстал, сярод іх Дзмітрый Валент (81 кг), Віталь Гуркоў (75 кг) і Алена Ляшкевіч (45 кг). Значнай стратай для беларускай зборнай стала адсутнасць Андрэя Кулебіна, які не зможа прыняць удзел у чэмпіянаце свету.

— На жаль, аб сабе нагадала старая траўма нагі, з'явілася трэшчына, і ўрачы настаялі на пропуску турніру, — адзначыў **галоўны трэнер беларускай каманды Міхаіл СЦЯПАНАЎ**. — У вагавай катэгорыі да 71 кг аднаго з лідараў каманды Андрэя Кулебіна заменіць малады і таленавіты Вадзім Васькоў.

Нагадаем, летась з чэмпіянату свету ў Швецыі зборная Беларусі вярнулася з дзесяццю ўзнагародамі: 5 залатымі, 1 сярэбраным і 4 бронзавымі медалямі. Гэтага аказалася дастаткова, каб у агульным заліку заняць другое месца, прапусціўшы наперад толькі родапачынальнікаў гэтага віду спорту — тайскіх баксёраў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «Полоцкая строительная компания», 211400, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Суворова, д. 64

**Лот №1.** MERCEDES-BENZ SPRINTER 311, грузопассажирский вагон, рег. знак АЕ 1703-2, цвет белый, 2005 г.в. Начальная цена: 17 900 руб. без НДС. Задаток: 1 790 руб.

**Лот №2.** FORD TRANSIT, грузовой бортовой тентовый, рег. знак АА 4213-2, цвет синий, 1995 г.в. Начальная цена: 4 000 руб. без НДС. Задаток: 400 руб.

**Лот №3.** Грузовой специальный самосвал MAZ 5551, рег. знак АА 7204-2, цвет светло-серый, 1999 г.в. Начальная цена: 4 000 руб. без НДС. Задаток: 400 руб.

**Лот №4.** Автобус вагон PAZ 3205 3R, 2004 г.в., цвет бело-синий, рег. знак AI 1341-2. Начальная цена: 2 200 руб. без НДС. Задаток: 220 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 05.06.2017 г. в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах с 04.05.2017 с 8.30 по 02.06.2017 г. до 17.30. Сумма задатков перечисляется на р/с 3012451460017 в ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление г. Витебск, код 150801424, УНП 390455266. Получатель платежа: ООО «Полоцкая строительная компания». Движимое имущество расположено по адресу: г. Полоцк, ул. Суворова, 64. Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 12 мая 2017 года**
на 6-м открытом аукционе проводит 3-й от 23 марта 2017 г.
и 5-й от 28 апреля 2017 г. повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 17 | Грузовой Урал-4320-0710 ш. 087792 дв. б/н 1987 г. *4 кат. 119 043 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 900 | 790 |
| 41 | Грузовой КрАЗ-255 ш. 465 рама 308242 дв. 782844 1977 г. *4 кат. 34 301 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668, | 5 000 | 500 |
| 42 | Седельный тягач МАЗ-537 ш. 88073789 дв. Е05кт9143 1988 г. *4 кат. 25 600 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 500 | 850 |
| 43 | Седельный тягач МАЗ-537 ш. 88084710 дв. я05кт6037 1988г. *4 кат. 18 510 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 11 800 | 1 180 |
| 45 | Автошасси Урал-375 ш. 447015 дв. 625983 1986 г. *4 кат. 1 263 км* | н.п. Станьково, в/ч 74962 | 4 000 | 400 |
| 46 | Автошасси Урал-375АМ ш. 430964 дв. 278100 1984 г. *4 кат. 1782 км* | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 4 200 | 420 |
| 47 | Автошасси Урал-375АМ ш. 432231 дв. 289001 1984 г. *4 кат. 1 857 км* | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 4 200 | 420 |
| 48 | Автошасси Урал-375АМ ш. 428751 дв. 244920 1984 г. *4 кат. 1 816 км* | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 4 200 | 420 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **12 мая 2017 г. в 11.00.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **15.00 6 мая 2017 года**.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **12 мая 2017 г. с 9.00 до 9.45.**
**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701, ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by.**
Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» №33 от 17 февраля 2017 г. и №57 от 25 марта 2017 г.

Утерянное свидетельство о гос. регистрации ИП Новиков Д.В. (УНП 690263500) считать недействительным

# КВАДРАТ ПАТАННЕЕ І... БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ?



## Палова дома як альтэрнатыва кватэры

Адсутнасць даступных крэдытных рэсурсаў і невялікія даходы насельніцтва прывялі да таго, што ў апошнія некалькі гадоў стабільным попытам у якасці альтэрнатывы кватэры ў сталіцы карыстаюцца бюджэтныя дамы або іх часткі (індывідуальны жылы дом, падзелены напалову вертыкальнай сцяной і абсталяваны двума ўваходамі) у найбліжэйшым прыгарадзе Мінска.

— Іх набываюць у мэтах эканоміі сродкаў тыя пакупнікі, у каго няма магчымасці набыць аднапакаёвую кватэру, і не толькі ў Мінску, але і найбліжэйшых населеных пунктах, — расказвае **спецыяліст па загараднай нерухомасці агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Алена АКУЛІЧ.** — Часта можна сутыкнуцца з сітуацыяй, калі маладая сям'я набывае палову дома, напрыклад у Калодзішчах, бо нават на аднапакаёвую кватэру ў гэтым населеным пункце сродкаў не хапае, а абцяжарваць сябе крэдытамі не хочацца.

Звычайна цана такога аб'екта будзе ў межах ад 20 да 25 тысяч долараў (на ўзроўні цаны якаснага пакоя ў Мінску). Абсалютная большасць падобных дамоў драўляныя, але сустракаюцца і зборна-шчытавыя.

## Попыт знізіцца ў маі?

Галоўнае сёння пытанне — ці зможа павышаная актыўнасць пакупнікоў захавацца і ў другім квартале. Нагадаем, што пікавы попыт у мінулым годзе (і за ўвесь час назіранняў), прыйшоўся якраз на другую чвэрць года. Тады з-за ажыятажу, празванага, у народзе «хапуном», на траціну скарацілася прапанова, і пачалі расці кошты на кватэры. Паводле інфармацыі спецыялізаванага партала жыллёвай нерухомасці, можна ацаніць вынікі сакавіка, калі агульная колькасць выстаўленых на продаж кватэр павялічылася на 3,3%, а ў красавіку яна склала 7816 аб'ектаў.

Найбольш актыўны рост попыту быў адзначаны ў сегменце аднапакаёвых кватэр (+ 45% да лютаўскага ўзроўню). Дзякуючы гэтаму доля аднапакаёвак у агульнай структуры попыту павялічылася да 38%, але гэта па-ранейшаму ніжэй за сярэдняе шматгадовае значэнне. Летась увесну на такія кватэры прыходзіўся 41% усіх здзелак. А гэта можа сведчыць аб тым, што чысты продаж на рынку цяпер сустракаецца радзей, а абменных здзелак, наадварот, стала больш.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У разрэзе якасных характарыстык жылля перавагі пакупнікоў у параўнанні з лютым не змяніліся, чаго не скажаш пра геаграфію попыту. Пакупнікі перанакіравалі свой позірк у бок больш «бюджэтных» раёнаў: Фрунзенскага, Ленінскага і Заводскага. Цікавасць да больш «дарагіх», Першамайскага і Цэнтральнага, наадварот, панізілася. Сярэдняя цана ўсіх відаў кватэр, разлічаная на аснове здзелак куплі-продажу, знізілася на 0,4% і склала ў сакавіку 1127 долараў за квадратны метр. Тры з апошніх чатырох месяцаў гэты паказчык дэманстраваў негатыўную дынаміку, але ад сапраўды сур'ёзнага паніжэння коштаў утрымлівае актыўнасць пакупнікоў.

Зрэшты, хваля пакупніцкага ажыятажу, якая сёлета стартавала раней, мае ўсе шанцы раней і «захлынуцца». Попыт цяпер трымаецца ў тым жа коштавым дыяпазоне, што і ў мінулым годзе. Невядома, якая колькасць пакупнікоў мае дастаткова сродкаў, каб здзейсніць здзелкі. Але дынаміка дэпазітаў адназначна сведчыць пра тое, што накапленняў становіцца менш.

Гэта асабліва актуальна, калі мы гаворым аб пакупніках з рэгіёнаў. Па розных ацэнках летась яны мелі дачыненне да кожнай чацвёртай, калі не кожнай трэцяй здзелкі.

## Прадаўцы прапануюць рэальныя цэны

Пад ціскам новых аб'ектаў, якія прыбываюць на рынак, індэкс цэн прапановы працягвае апускацца. Тут эксперты адзначаюць, што разрыў паміж сярэднімі цэнамі прапановы і рэальных здзелак скараціўся ў сакавіку да 3,5%. Апошні раз нешта падобнае назіралася летам 2014 года. Сярэдняя цана прапановы адчувальна знізілася па жыллі ў раёне вуліцы Кахоўскай, мікрараёнах Міхалова, Навінкі і каля аўтазавода. Наадварот, з вялікім плюсам (больш за 2%) месяц скончылі Чырвоны Бор, раёны вуліц Альшэўскага і Макаёнка.

Можна меркаваць, што за новым наплывам пакупнікоў крыецца псіхалагічны аспект. За зімовыя месяцы цэны крыху знізіліся, а база прапановы папоўнілася тысячай новых аб'ектаў. Па суадносінах кошт/якасць выбар на рынку стаў збольшага нагадваць першае паўгоддзе мінулага года. Тыя, хто па нейкіх прычынах адклаў куплю вясной летась, цяпер перайшлі да актыўных дзеянняў.

Маючы ў якасці прыкладу вопыт мінулага года, нескладана выказаць здагадку пра далейшае развіццё падзей, калі попыт застанецца высокім. Найлепшыя бюджэтныя прапановы пачнуць вымывацца, што пацягне ўверх сярэднюю цану здзелкі. Пакуль гэтага не адбываецца, бо база паспявае папаўняцца новымі аб'ектамі. Больш таго, прыход новых прадаўцоў у другой палове вясны, напэўна, замарудзіцца з-за пачатку дачнага сезона, а потым і перыяду летніх адпачынкаў.

## Патанненне працягнецца да канца года

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што галоўная лінія цэнавой тэндэнцыі на працягу года будзе менавіта такой. І аснoўным фактарам тут з'яўляецца адсутнасць у эканоміцы нашай краіны магчымасці істотна павялічыць даходы сярэдняга класу работнікаў. У гэтай катэгорыі не існуе пакуль упэўненасці, што іх заробкі будуць вялікімі і стабільнымі. Складаная эканамічная абстаноўка па ўсім перыметры постсавецкіх краін сведчыць аб тым, што вялікага прыбытку і ад знешняга гандлю ў найбліжэйшы час наша дзяржава не атрымае.

Адзіна рэальнай дапамогай для захавання высокага попыту на рынку бачыцца зніжэнне ставак па крэдытах, аднак... Ва ўмовах стабільнага курса рубля крэдыты па-ранейшаму застаюцца дарагімі, але ўжо могуць дазволіць выйсці на рынак тым, каму «крыху не хапае». Спадар Прасталупаў адзначае, што цяпер на рынку нерухомасці толькі каля 1—2% кліентаў карыстаюцца кароткімі грашыма банкаў.

Існуе і яшчэ адзін фактар. Сёння ў Мінску агульная колькасць аб'ектаў прапановы жылля на продаж складае каля 10 тысяч жылых памяшканняў, дзе прыкладна 10—15% ад гэтага аб'ёму прыпадае на незаселеныя кватэры здадзеных у эксплуатацыю новых дамоў, якія былі пабудаваны камерцыйнымі арганізацыямі па лініі «далёкі». Падобнае жыллё «правісае» на рынку ўжо даволі працяглы час. Разам з тым наш эксперт паведамляе, што ўласнікі такіх кватэр катэгарычна адмаўляюцца прадаваць іх танней. Яны арганізуюць розныя акцыі з адтэрміноўкай, паэтапнай аплатай і іншымі фокусамі, якія рэальна не зніжаюць цэны.

Масавае выкарыстанне такіх механізмаў выклікае нават падазрэнне ў тым, што арганізатары жыллёвага камерцыйнага будаўніцтва не канкуруюць паміж сабой, а займаюцца метанакіраваным утрыманнем цэн. А гэта ўжо нагадвае змову. Калі спецыялісты рынку не памыляюцца, то сітуацыяй можа зацікавіцца і наша антыманапольнае міністэрства.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «НАСУСТРАЧ АДПАЧЫНКУ»

Настоящие Правила разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Насустрач адпачынку» (далее – Игра), проводимой в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) среди участников программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющих брелоком (накопительные информационно-учетные карты с индивидуальным номером, в дальнейшем – Брелок), в г. Минске, Минской области, Брестской области.

**1. Организатор Игры**

Организатором Игры является Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), находящееся по адресу: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения; УНП 690362737; E-mail: a-100@a-100.by.

**2. Наименование игры**

Игра носит название «Насустрач адпачынку».

**3. Участники Игры**

В Игре могут принять участие дееспособные физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, владеющие Брелоком.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Права участников Игры**

Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами, и получать соответствующие Призы.

Каждый Участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз.

**5. Сроки проведения Игры**

Начало Игры: 5 мая 2017 года.

Окончание Игры: 15 июня 2017 года.

**6. Территория проведения Игры**

Республика Беларусь, а именно, территория, на которой расположены автозаправочные станции ОДО «Астотрейдинг» (далее – АЗС ОДО «Астотрейдинг»): г. Минск, Минская область, Брестская область.

**7. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) среди участников программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющих Брелоком.

| Наименование | Количество, призов | Общая стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| Денежные средства на приобретение топлива в размере 13 рублей в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» | 250 | 3250 |

**8. Призовой фонд**

Призовой фонд игры в размере **3250** (три тысячи двести пятьдесят) белорусских рублей формируется за счет денежных средств Организатора.

**9. Порядок участия в Игре**

9.1. Для участия в Игре участники программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющие Брелоком, в период с 00:00:01 5 мая 2017 года по 23:59:59 8 июня 2017 года должны заправиться любым видом топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) на сумму 20 (двадцать) белорусских рублей и более в одном чеке на любой АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп. 3 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС №11 | г. Минск, ул. Машиностроителей, 7Б |
| АЗС №12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС №13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13А |
| АЗС №15 | г. Минск, ул. Промышленная, 2Б (МКАД) |
| АЗС №16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 (МКАД) |
| АЗС №17 | г. Минск, ул. Некрасова, 41 |
| АЗС №18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15 км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40 |
| АЗС№22 | Минская обл., Смолевический р-н, автодорога Минск-Брест-граница РФ, км. 388 (право) |
| АЗС№23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС№24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС№25 | Минский р-н, аг. Сеница, ул. Зеленая,1/4 |
| АЗС№26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС№27 | г. Брест, ул. Радужная, 20 |
| АЗС№28 | г. Брест, пр-т Республики, 6 |
| АЗС№29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |
| АЗС№30 | г. Минск, ул. Аннаева, 47 |
| АЗС№31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС№32 | Брестская область, Малоритский р-н, агр. Мокраны, ул. Брестская |
| АЗС№35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

9.2. В Игре принимают участие только владельцы зарегистрированных Брелоков. Зарегистрировать Брелок необходимо через личный кабинет, ссылка на который расположена на главной странице официального сайта Организатора по адресу http://azs.a-100.by/. Для регистрации необходимо:

- заполнить все обязательные поля в анкете (помеченные символом * (звездочка), а именно: фамилия, имя, отчество, пол, дата рождения, адрес электронной почты, номер мобильного телефона, адрес проживания, вид топлива;

- получить на указанный пользователем в анкете номер телефона код активации, ввести его в личном кабинете;

- завершить регистрацию, нажав на соответствующую кнопку.

9.3. Участник может участвовать в Игре неограниченное количество раз.

9.4. В Игре принимают участие участники, выполнившие требования настоящих Правил.

**10. График проведения розыгрышей призового фонда**

Розыгрыши призового фонда Игры проходят еженедельно по пятницам: 12.05.2017, 19.05.2017, 26.05.2017, 02.06.2017, 09.06.2017 в 10.00 в офисе ОДО «Астотрейдинг», расположенном по адресу: г. Минск, Минский р-н, д. Боровая, 7.

**11. Механика розыгрыша призового фонда Игры. Определение победителя Игры. Информирование победителей**

11.1. В дни розыгрышей в 9.00 формируем список тех участников рекламной игры, которые выполнили все условия Игры за неделю, а именно:

12.05.2017 за неделю с 05.05.2017 по 11.05.2017;
19.05.2017 за неделю с 12.05.2017 по 18.05.2017;
26.05.2017 за неделю с 19.05.2017 по 25.06.2017;
02.06.2017 за неделю с 26.05.2017 по 01.06.2017;
09.06.2017 за неделю с 02.06.2017 по 08.06.2017.

Количество призов в еженедельном розыгрыше 50.

11.2. Все участники, выполнившие все условия, автоматически становятся участниками розыгрыша.

11.3. Номера брелоков программы «Дзякуй» всех участников, выполнивших условия рекламной игры в определенный период, распечатываются на карточках, которые помещаются в лототрон. В случае если участник выполнил условия Игры несколько раз, то в лототрон помещается количество карточек с номером его брелока, равнократное количеству раз выполненного им условия Игры. Член комиссии раскручивает лототрон и в случайном порядке извлекает из него 50 карточек с номерами карт-брелоков программы «Дзякуй», определяя таким образом победителей розыгрыша.

11.4. Итоги розыгрыша призового фонда Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии. К Протоколу комиссии прикладывается заверенный надлежащим образом Акт о транзакциях по Брелокам.

11.5. Участники Игры вправе еженедельно ознакомиться с результатами розыгрыша на официальном сайте компании http://azs.a-100.by/company/news. Результаты розыгрыша будут опубликованы на сайте в день розыгрыша в 16.00.

11.6. Информирование победителя производится по электронной почте путем письменного уведомления о выигрыше и СМС-сообщения на указанный в личном кабинете номер телефона в день розыгрыша. Дополнительное информирование победителя осуществляется путем сообщения в личном кабинете участника программы благодарности «Дзякуй» по результатам проведения розыгрыша.

**12. Порядок выдачи призов**

Выдача приза осуществляется в день розыгрыша после его проведения путем зачисления на счет в личном кабинете эквивалента денежных средств в размере 13 белорусских рублей на приобретение топлива в сети «А-100». Зачисление эквивалента денежных средств производится в зависимости от выбранного в личном кабинете участником топлива в графе «Вид топлива» при регистрации Брелока.

Приз, зачисленный на счет в личном кабинете, необходимо использовать на АЗС ОДО «Астотрейдинг» по целевому назначению по 01.07.2017 (включительно).

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с настоящими Правилами, в том числе с условиями выдачи приза, а также с тем, что в рамках Игры их фамилии, имена, отчества, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения.

Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленном правилами порядке и сроки либо невыполнения условий его получения приз остается у Организатора и используется по своему усмотрению.

**13. Состав Комиссии по проведению Игры**

Для проведения Игры, контроля за соблюдением Правил Игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения розыгрыша Организатором создается комиссия по ее проведению в следующем составе:

Председатель Комиссии – начальник отдела маркетинга ОДО «Астотрейдинг» Ермак Елена Александровна.

Члены Комиссии:

- специалист по работе с клиентами ОДО «Астотрейдинг» Казеко Анастасия Алексеевна;

- главный бухгалтер ЧП «Биминок» Субоч Татьяна Евгеньевна;

- заместитель директора по правовым вопросам ОДО «Астогарант» Лабазинский Дмитрий Болеславович;

- начальник службы оперативной аналитики ОДО «Астотрейдинг» Лапицкий Юрий Александрович.

**14. Информация об Игре, публикация Правил Игры.**

Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала рекламной игры.

Результаты Игры будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 13.06.2017 г.

Дополнительно информацию об Игре можно получить на Интернет сайте Организатора: http://azs.a-100.by/company/news.

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по телефону +375 17 233-33-33 (понедельник – четверг, с 8.30 – 17.30, пятница – 8.30 – 17.00) или на сайте Организатора.

**15. Прочие условия**

Споры между Организатором рекламной Игры и Участниками рекламной Игры рассматриваются согласно действующему законодательству Республики Беларусь.

Свидетельство о регистрации рекламной игры №2991 от 29 апреля 2017 г.
выдано Министерством антимонопольного регулирования
и торговли Республики Беларусь

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
4 МАЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№9 (15816)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Марыя БАГАТЫР: «Невыканальных заданняў няма»



**Марыя Багатыр з'явілася на беларускім тэлебачанні не так даўно. Аднак ужо паспела заваяваць сэрцы многіх тэлегледачоў сваёй чароўнай усмешкай, непасрэдным падыходам да работы і абавязкова добрым настроем. Спачатку яна зараджала энергіяй на ўвесь дзень гледачоў ранішняй праграмы «Сталічнага тэлебачання», а затым з галавой акунулася ў спорт і цяпер практычна штодня распавядае пра спартыўныя навіны з экрана тэлеканала «Беларусь 5».**

**У сваім інтэрв'ю Маша падзялілася тым, як трапіла на тэлебачанне, расказала аб кур'ёзных момантах у працы і прыадкрыла сакрэт свайго асабістага жыцця.**

***— Марыя, звычайна на тэлебачанні працуюць людзі, якія мараць быць вядомымі...***

— Гэта дакладна не мой выпадак. Я выдатна разумею, што вядомай можна стаць за пяць хвілін, дастаткова зняць скандальны відэаролік і выкласці яго ў інтэрнэт. Толькі што потым рабіць з такой славай? Я заўсёды ведала: у якой сферы дзейнасці я ні буду працаваць, усюды стану профі, бо нельга інакш. Пакуль не магу сказаць, што ўжо з'яўляюся прафесіяналам на тэлебачанні, таму шмат працую, удасканальваюся і вучуся кожны дзень.

***— Гэта значыць, што ў дзяцінстве аб тэлекар'еры не марылі?***

— Я заўсёды чымсьці займалася: танцамі, вакалам, акцёрскім майстэрствам. Хацелася патануць у творчасці. Хоць аднойчы думкі з'явіліся і пра медыцыну. Казала бабулі, што стану доктарам і буду яе лячыць. Потым быў перыяд, калі марыла стаць стаматолагам і дарыць людзям добрую ўсмешку. Адным словам, мяне доўга адольвалі сумненні. А потым мама неяк кажа: «Маша, можа быць, журналістыка?» Так і вырашылася пытанне з маёй будучыняй. І трэба сказаць, ні разу не пашкадавала пра свой выбар! Калі паступіла ў інстытут, бачыла, як «гараць» гэтай прафесіяй мае аднакурснікі, а потым многія з іх проста «перагарэлі». У мяне ж атрымалася адваротная сітуацыя: мне падабалася вучыцца, штогадова праходзіць практыку. Спачатку думала, што буду пішучым журналістам, але ў нейкі момант адна з маіх выкладчыц прапанавала паспрабаваць сябе на тэлебачанні.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# СІЛА ЦЯГІ

## Яе ў спецыяліста лакаматыўнага дэпо хапае на ўсё!

**Завод «Палімір», што пад Наваполацкам, займае велізарную плошчу. У адных цэхах працуюць над вырабам поліэтылену, у іншых выпускаюць акрылавае валакно — нітрон, у трэціх — так званую малатанажную хімію (поліэтыленавыя воск і эмульсію, канцэнтраты пігментаў і нават азотныя ўгнаенні). Але работа ўсяго гэтага аграмаднага арганізма спыніцца, калі перастане працаваць невялікі ўчастак на ўскраіне заводскай тэрыторыі — чыгуначны цэх.**

**Для забеспячэння «Паліміра» сыравінай і транспарціроўкі гатовай прадукцыі працуюць пяць цеплавозаў. Іх доглядам займаецца брыгада, у складзе якой працуе малады слесар-электрык па рамонце электраабсталявання Аляксандр ВАСІЛЕЎСКІ.**

— Пра тое, што стану электрыкам, ведаў з дзяцінства, — усміхаецца хлопец. — Гэта прафесія майго бацькі, і калі я быў маленькі, то, вядома, сачыў за тым, як ён працуе, нават спрабаваў дапамагаць. Адзіны мінус — любіў лезці ў разеткі, таму, што такое ўдар токам, ведаю не па чутках. Пасля школы пайшоў вучыцца ў Наваполацкі дзяржаўны політэхнічны каледж, потым па размеркаванні трапіў у трамвайны парк. Адпрацаваў там тры гады, але не магу сказаць, што мне вельмі падабалася. А пасля пашанцавала — у чыгуначным цэху «Паліміра» ўзялі новую вакансію слесара-электрыка, і пасля гутаркі мяне ўзялі на работу. З тых часоў тут і шчыру.

Лакаматыўнае дэпо чыгуначнага цэха — гэта вялікі ангар, дзе стаяць і рамантуюцца цеплавозы ТГМ4Б. Усё ўладкавана па тым жа прынцыпе, што і ў дэпо пасажырскіх паяздоў — паміж рэйкамі знаходзіцца яма, з якой можна атрымаць доступ да хадавой часткі, пад дахам — маставы кран, які выкарыстоўваецца для пад'ёму шматтоннага абсталявання. На змене пастаянна працуюць два цеплавозы.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Час вызначацца

# АД МАРЫ — ДА ПОСПЕХУ

## Чаму першакурснікі БДУІР не хаваюцца на «камчатцы»?



Убачыць студэнцкае жыццё без прыкрас і даведацца, чым вучоба ў ВНУ адрозніваецца ад школьных будняў, пашчасціла 60 адзінаццацікласнікам.

**«Я люблю глядзець на зорнае неба і марыць. Мая мара — стаць высакакласным праграмістам і стварыць што-небудзь незвычайнае і ўнікальнае. Магчыма, гэта будуць праграмы для якіх-небудзь касмічных распрацовак.**

**У 11-м класе я выйграў гарадскую алімпіяду па астраноміі. Хтосьці можа спытаць: а што можа быць агульнага паміж астраноміяй і праграмаваннем? Мне здаецца, ІТ-тэхналогіі — гэта, у пэўным сэнсе, «космас» чалавечага развіцця, на гарызонце якога з'яўляюцца ўсё новыя і новыя «планеты» — спецыялізацыі, напрыклад, камп'ютарная лінгвістыка і штучны інтэлект, робататэхніка і праграмнае забеспячэнне для робатаў... Да таго ж і магчымасці чалавецтва становяцца «касмічнымі».** Сваё эсэ адзінаццацікласнік з бабруйскай гімназіі №2 Захар СТУПЕНЬ назваў «Космас» чалавечага развіцця» і адправіў яго ў БДУІР. Канешне, яно не магло застацца не заўважаным і стала для юнака пропускам у праект «# ЯўБДУІР». Сёлета ён прайшоў ужо другі раз. Паўдзельнічаць у праекце пажадала больш як 100 чалавек. Абавязковай умовай для прэтэндэнтаў было сэлфі, зробленае падчас Дня адкрытых дзвярэй ва ўніверсітэце, і напісанне эсэ, у якім абітурыенты тлумачылі сваю матывацыю.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# АД МАРЫ — ДА ПОСПЕХУ

## Калі вучыцца, дык у лепшых!

«А яшчэ, як мне здаецца, праграмаванне падобна на класічную музыку, якую я люблю слухаць: сваёй матэматычнай стройнасцю, упарадкаванасцю, імправізацыяй, натхненнем і геніяльнай завершанасцю — словам, нічога лішняга, шэдэўр у чыстым выглядзе. Гэта ў поўнай ступені адносіцца і да музычнага твора, і да дасканала напісанай камп'ютарнай праграмы, — напісаў Захар. — Лічу, нічога хоць трохі значнага ў гэтым свеце нельга стварыць без натхнення і імправізацыі, якія дазваляюць ажыццявіць прарыў у любой галіне... А праграмаванне, на мой погляд, гэта своеасаблівая «ўнутраная музыка», якая робіць наш свет больш цікавым, адкрываючы перад чалавецтвам усё новыя і новыя гарызонты развіцця.

У пэўным сэнсе я максімаліст і лічу: калі чамусьці вучыцца, дык толькі ў лепшых спецыялістаў. А Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, безумоўна, з'яўляецца лепшай ВНУ ў краіне, якая рыхтуе высокакваліфікаваныя, запатрабаваныя ў многіх галінах прамысловасці кадры. Я хачу развівацца, спазнаваць новае і самаўдасканальвацца, таму мой выбар — БДУІР! І гэта адзін з галоўных крокаў да маёй мары».

## Інтэрнат як прыемны бонус

Убачыць студэнцкае жыццё без прыкрас і даведацца, чым вучоба ў ВНУ адрозніваецца ад школьных будняў, пашчасціла 60 адзінаццацікласнікам. Іх расклад быў распісаны літаральна па хвілінах: наведванне лекцый і лабараторных работ, знаёмства з вучэбна-навуковымі цэнтрамі на некалькіх факультэтах і універсітэцкім спартыўным комплексам, абед у студэнцкай сталовай, «экскурсія» на фестываль творчасці «Студэнцкая вясна — 2017» і адкрыты чэмпіянат БДУІР па праграмаванні. Плюс брыфінг з адказным сакратаром прыёмнай камісіі і сустрэча з паспяховым выпускніком.

**Раман МЯЗІН, адзінаццацікласнік баранавіцкай гімназіі №4** у сваім эсэ напісаў: «Я хачу ісці ў нагу з часам, атрымліваць адукацыю, якае гарантуе цікавую работу, магчымасць пастаяннага самаўдасканалення. Гэта бадай што першае адказнае рашэнне ў маім жыцці. Я выбіраю БДУІР! Высокая планка... Але на маім пісьмовым стале пад шклом напісана: «Гэта немагчыма!» — сказала Прычына. «Гэта безразважнасць!» — заўважыў Вопыт. «Гэта марна», — адрэзаў Гонар. «Паспрабуй...», — шапнула Мара».

Каб здзейсніць сваю мару, хлопцу трэба будзе набраць ад 330 да 345 балаў. «Калі не прайду на бюджэт, буду падаваць дакументы на платнае, але больш чым 6—7 спецыяльнасцяў у сваіх прыярытэтах указваць усё роўна не стану, — прызнаўся хлопец. — Проста не бачу ў гэтым сэнсу». Вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання дазваляюць юнаку спадзявацца на лепшае. «Рускую мову і матэматыку пастараюся «выцягнуць» на 90 балаў і па фізіцы спадзяюся атрымаць не ніжэй за балаў 86, — канстатуе ён. — Займаюся з рэпетытарамі па ўсіх трох прадметах. А як яшчэ можна здаць добра тэст па рускай мове, калі ў фізіка-матэматычным класе на яго адводзіцца ўсяго адна гадзіна ў тыдзень?»

— У студэнтаў БДУІР вельмі інтэнсіўны рытм жыцця. І, каб стаць паспяховым, трэба шмат працаваць, — шчыра папярэджвае патэнцыяльных абітурыентаў **куратар праекта, кіраўнік прэсслужбы БДУІР Ала БАЯРКА.** — Увогуле, вы жывяце ў вельмі цікавы, але няпросты час, бо цяпер немагчыма атрымаць адукацыю на ўсё жыццё. У трэндзе сёння робататэхніка, штучны інтэлект, мікра- і нанаэлектроніка. Але ніхто не ведае, якія прафесіі будуць у трэндзе заўтра. Асабіста я параіла б усім, хто нацэліўся на інжынерна-эканамічны факультэт, падстрахавацца і здаць на ЦТ у якасці чацвёртага прадмета яшчэ і фізіку, бо там зусім невялікі набор на бюджэтныя месцы. А наяўнасць сертыфіката па фізіцы дазволіць вам выбіраць любую спецыяльнасць на ўсіх іншых нашых факультэтах.

Дарэчы, адзін з важных бонусаў праекта «# ЯўБДУІР» — гэта гарантаванае месца ў студэнцкім інтэрнаце для ўсіх іншагародніх яго ўдзельнікаў. Праўда, гэты бонус дзейнічае толькі першы год, а далей ужо ўсё залежыць ад паспяховай вучобы і грамадскай актыўнасці новаспечаных студэнтаў. Але ўсё ў іх руках...

## Сесія з валяр'янкай

Цікава, што летась дзень, праведзены школьнікамі ва універсітэце, забяспечыў ім не толькі мноства ўражанняў, але і моцную матывацыю да паступлення: 90% з іх сталі студэнтамі універсітэта.

— Асабіста я пасля праекта яшчэ больш разгубілася. Мне сталі падабацца практычна ўсе факультэты, — смяецца **Анастасія ШАЙПАК, першакурсніца факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання.** — Проста пераканалася, што цікавых і перспектыўных спецыяльнасцяў вельмі шмат. Таму ў спіс сваіх прыярытэтаў унесла іх аж дванаццаць. Але па сваіх балах прайшла на трэцюю спецыяльнасць, указаную ў прыярытэтах — «прамысловая электроніка».

— Калі ў чалавека ёсць мэта і сіла волі, ён будзе развівацца ў абраным кірунку, нават калі яму і не ўдалося паступіць на першую спецыяльнасць, — запэўнівае яшчэ адна ўдзельніца леташняга праекта **Аляксандра ХАВАНСКАЯ, студэнтка спецыяльнасці «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў лагістыцы» інжынерна-эканамічнага факультэта.** — Так, першая сесія ў мяне прайшла з валяр'янкай. Хоць я і здала ўсе прадметы з першага разу, але шчыра скажу, што было страшна. Паступіць — не самае галоўнае. Вучоба тут сур'ёзная...

А вось **Кірылу КЛІМОВІЧУ** ўдалося ўвасобіць мару тысяч абітурыентаў і стаць студэнтам самай прэстыжнай, калі меркаваць па прахадных балах, спецыяльнасці «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак (ФКСіС).

— Напрыканцы 8-га класа я ўжо дакладна ведаў, што буду паступаць у БДУІР, хоць да гэтага моманту ў мяне былі непаразуменні з фізікай. Але калі дайшлі да тэмы «электрычнасць», тут я і «загарэўся». Цвёрда вырашыў, што буду выбіраць інжынерную спецыяльнасць. «Загугліў» у інтэрнэце і выйшаў на ФКСіС. Тры гады вагаўся, кім хачу быць: праграмістам ці сістэмным праграмістам? У выніку выбраў інжынера — сістэмнага праграміста: гучыць больш крута, — жартуе хлопец. — На праекце «# ЯўБДУІР» сустрэў «клёвых» хлопцаў і дзяўчат: мы стварылі «УКантакце» сваю групу і цяпер наш пазыўны «Чацвёрты інтэрнат, хто дома?»

— Самым каштоўным у праекце было наладзіць сувязі і знайсці сяброў. Дзякуючы сацыяльным сеткам мы былі ў курсе спраў усіх, да і зараз не губляем адзін аднаго, — падтрымлівае **Мікіта КЛЮШУН, першакурснік факультэта камп'ютарнага праектавання**. — Уліцца ў студэнцкае жыццё дастаткова складана. Тое, што нам даюць у школе, усяго толькі шчылінка ў фізіку і матэматыку.

Нядзіўна, чаму ў першыя месяцы вучобы студэнты на матэматыцы спрабуюць заняць у аўдыторыі першыя сталы: каб быць бліжэй да выкладчыка, усё пачуць і нічога не прапусціць. Займаюць іх за паўгадзіны да лекцыі. Пры гэтым для ўсіх першакурснікаў, якія маюць у гэтым патрэбу, арганізуюцца дадатковыя бясплатныя заняткі, якія дапамагаюць падцягнуць узровень іх падрыхтоўкі.

## Размеркавацца... ва ўласную кампанію

«Дэвіз факультэта камп'ютарных сістэм і сетак — «Ад мары — да поспеху». Паверце, у ім закладзены глыбокі сэнс», — звярнуўся да ўдзельнікаў праекта «# ЯўБДУІР» **пяцікурснік Павел ЛІТВІНКА**.

Пяць гадоў таму хлопец стаў студэнтам ФКСіС без экзаменаў, дзякуючы перамозе ў рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. Ужо ва універсітэце ён захапіўся стартап-рухам, стаў наведваць тэматычныя мерапрыемствы, удзельнічаць у хакатонах і акселератарах і перамагаць там са сваімі праектамі. А ў 20 гадоў разам з сябрамі, таксама студэнтамі, зарэгістраваў стартап ALTA-AL і заняўся распрацоўкай штучнага інтэлекту для «ботаў». Мэтай было стварыць праграму, якая будзе дапамагаць чалавеку здзяйсняць выбар, даваць парады падчас нефармальных стасункаў з «ботам» у чаце (накшталт стасункаў з рэальным чалавекам), напрыклад, які выбраць крэдыт ці дэпазіт, у якім абменным пункце больш выгадныя курсы валют, дзе знаходзіцца найбліжэйшае аддзяленне банка і гэтак далей. Чат-бот «Альта» быў задуманы як рэальны фінансавы памочнік, якога трэба было навучыць разумець пытанні, сфармуляваныя звычайнымі людзьмі.

— Я даўно распрацоўваю праграмныя прадукты, але ніколі раней не чуў, каб людзі прызнаваліся праграме ў каханні, яны стасаваліся з «ботам» як з жывым чалавекам. Мы бачылі, што людзям падабаецца тое, што мы робім, і гэта нас натхняла...

Сёння Павел Літвінка ўзначальвае ТАА «Ботскейп», разам са сваімі сябрамі займаецца тэхналогіямі машыннага навучання і стварае «боты» для розных мэт. Без пяці хвілін выпускнік не любіць, калі пра яго кажуць, што ён паспяховы.

— Поспех можна вымяраць па-рознаму. Паспяховымі я лічу Біла Гейтса і Стыва Джобса. А мы яшчэ нічога прынцыпова новага не стварылі, — сціпла кажа ён і дзеліцца з будучымі першакурснікамі парадамі. — Час — вельмі важны рэсурс. Яго заўсёды не хапае. Але чым больш вы ставіце перад сабой задач, тым больш вам удаецца: раптам высветліцца, што вы яшчэ можаце запісацца на курсы кіравання і курсы вывучэння англійскай мовы. Паралельна ўдзельнічайце ў розных прафесійных мерапрыемствах, якія дапамагаюць у развіцці: наведвайце хакатоны, каб пазнаёміцца з цікавымі людзьмі і знайсці аднадумцаў. Збярыце сваю каманду. Памятайце, што выкладчыкі заўсёды ідуць насустрач і толькі вітаюць, калі студэнты кааперуюцца і робяць разам штосьці карыснае і цікавае.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
**Расклад удзельнікаў праекта «# ЯўБДУІР» быў распісаны літаральна па хвілінах...**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

*Хачу на журфак!*

# УПЭЎНІЦЦА Ў ВЫБАРЫ

**Не сакрэт, што за апошні час прафесія журналіста стала фактычна жаночай. Чамусьці не імкнуцца сучасныя хлопцы працаваць у СМІ! А дзяўчатам, як асобам больш эмацыянальным, некаторыя рэчы часам бачацца ў ружовых фарбах. Гэта датычыцца і выбару будучай прафесіі. Па вопыту ведаю, што многія абітурыенткі думаюць найперш толькі пра знешні, прывабны бок медаля. Вось я ў кадры перад тэлекамерай ці вось я на першых палосах газет...**

Пагадзіцеся, многія з вас уяўляюць працэс напісання матэрыялу менавіта так? Уключаеш ціхую прыемную музыку, заварваеш любімую гарбатку і, накрыты хваляй натхнення, пачынаеш тварыць... Ну, а калі не атрымліваецца, пераносіш усё на наступны дзень, тыдзень ці нават месяц. Сапраўды, цяпер вы вольныя рыхтаваць сваю публікацыю колькі заўгодна доўга. І думаеце: як толькі я прыйду ў рэдакцыю, усё пойдзе нашмат хутчэй. Мушу расчараваць многіх: калі тэм і натхнення няма зараз, пасля атрымання дыплома яны таксама аўтаматычна не з'явяцца. І працаваць вам давядзецца зусім у іншых умовах, калі замест музыкі будзе разрывацца тэлефон, уваходныя дзверы — круціцца ў верталётным рэжыме, а калегі па кабінеце дададуць яшчэ фону ад сябе. Але, самае галоўнае, вам нярэдка трэба будзе пісаць матэрыялы па вызначанай тэме, пэўнага аб'ёму і за дакладна прызначаны час. І часта паралельна вырашаць яшчэ многа іншых задач. І так — кожны дзень. Глядзець у столь у чаканні натхнення і атрымліваць асалоду ад гарбаткі дакладна не атрымаецца.

Але зноў жа з вопыту скажу, што і многія студэнты, якія праходзяць практыку, працягваюць паводзіць сябе, як тыя абітурыенты. Памятаеце, мы ўжо гаварылі пра неабходнасць змянення некаторых звычак? Канкрэтная парада: нягледзячы на вашу занятасць, паспрабуйце самі для сябе вызначаць тэрмін напісання матэрыялу і па магчымасці яго прытрымлівацца. Паверце, потым як знойдзеце. І яшчэ. Каб не было боязі перад чыстым аркушам паперы, вучыцеся пісаць спачатку ў галаве: у транспарце, падчас дамашняй работы, у любую вольную хвіліну. Журналістыка — гэта не станок на заводзе, які ўключаецца ў пачатку змены і выключаецца ў канцы. Як толькі прачнуўся, ты ўжо на рабоце: думаеш, разважаеш, заўважаеш. Некалькі невялікіх публікацый у раённай ці маладзёжнай прэсе — яшчэ не пацвярджэнне, што вы знайшлі сваё прызванне. Не сакрэт, што асабліва напрыканцы вучобы з падачы бацькоў і настаўнікаў будучы абітурыент настроены на своеасаблівае калекцыяніраванне рознага кшталту бонусаў, якія могуць яму дапамагчы пры паступленні: грамат, дыпломаў конкурсаў. На журфаку, па вялікім рахунку, пісаць, як, магчыма, многія памылкова думаюць, не вучаць. Гады вучобы даюць студэнту магчымасць развіць свае здольнасці і нават раскрыць таленты, замацаваць усё гэта падчас практыкі ў рэдакцыі і, калі пашанцуе, знайсці для сябе месца будучай працы. У аснове ж усяго ляжыць найперш усведамленне таго, што цябе чакае наперадзе. І моцнае жаданне гэтым займацца.

У вас яшчэ ёсць час або перагледзець сваё рашэнне, або канчаткова ўпэўніцца ў сваім выбары. Адна абітурыентка паступіла на журфак фактычна супраць волі бацькоў. І, не вытрымаўшы цяжару вучобы, была адлічана пасля першага курса... Другая, з найлепшых, прайшла туды без праблем, а потым расчаравалася ў прафесіі. Напярэдадні выпуску яна, маючы патэнцыяльнае працоўнае месца, не хоча яго займаць... У трэцяй і чацвёртай сітуацыя быццам бы падобная. Адну і другую, абедзвюх дзяўчат, якія падавалі надзеі, паступаць на журфак адгаварылі бацькі, маўляў, трэба мецьза плячыма больш сур'ёзную адукацыю. Адна задаволена сваім лёсам, другая праз нейкі час кінула вучобу і спрабуе вярнуцца да таго, што ёй так падабалася і атрымлівалася... Пра пятую абітурыентку, якая даймала пытаннямі па тэлефоне нават позна ўвечары і якая марыла стаць «зоркай» тэлеэкрана, нічога не чуваць некалькі гадоў... Шостая, таксама адна з пераможцаў нашага творчага конкурсу, хутка атрымае дыплом. Прафесія ёй падабаецца, толькі дзе яна будзе працаваць, дзяўчына пакуль не ведае... Усё гэта — канкрэтныя гісторыі толькі часткі колішніх абітурыентаў. Так што яшчэ раз усё ўзважце і самастойна зрабіце свой выбар. Усім — удачы!

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Крок да самастойнасці*

# ЗНЕШНАСЦЬ КАР'ЕРЫ НЕ ПЕРАШКОДА,

## або Ці можна знайсці работу па аб'явах?

**Самымі распаўсюджанымі матывамі, якімі моладзь кіруецца пры выбары той ці іншай спецыяльнасці, з'яўляюцца эмацыянальная сувязь з прафесіяй (тое, да чаго ляжыць душа — 47%) і пазнавальны інтарэс у адносінах да пэўнай галіны ведаў (35%). Далей ідуць запатрабаванасць спецыяльнасці на рынку працы ў сваёй краіне (20%), яе запатрабаванасць ва ўсім свеце (15%), лёгкасць навучання (13%) і высокая аплата працы спецыялістаў у гэтай галіне (10%). 8% рэспандэнтаў выбралі сваю спецыяльнасць, таму што яна была даступная для атрымання па месцы іх жыхарства, каля 9% прызналіся, што выбіралі, не задумваючыся, кіруючыся жаданнем проста атрымаць «якую-небудзь» вышэйшую адукацыю, а 7% апытаных вырашылі працягнуць прафесійную дынастыю. Сацыялагічнае даследаванне, прысвечанае праблемам і перспектывам працаўладкавання моладзі, правяла Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў ЦК БРСМ. У ім было задзейнічана 1900 рэспандэнтаў ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў, якія прадстаўлялі чатыры сацыяльна-дэмаграфічныя групы: гэта былі школьнікі працаздольнага ўзросту, студэнты, выпускнікі і працуючая моладзь.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Як высветлілася, бацькі і сваякі дапамагалі рэспандэнтам вызначыцца з прафесіяй, але канчатковае рашэнне прымалі ўсё ж такі самі апытаныя (60%). Каля 30% рэспандэнтаў выбіралі сваю прафесію цалкам самастойна, не звяртаючыся па дапамогу ці па парады да бацькоў. Але за 8% апытаных прафесійны выбар зрабілі бацькі.

Большасць студэнтаў, якія вучацца ў цяперашні момант (70%), упэўнены, што змогуць знайсці работу па спецыяльнасці ў сваёй краіне. Пры тым 35% мяркуюць, што гэта атрымаецца, паколькі іх спецыяльнасць запатрабаваная, 32% лічаць, што валодаюць дастатковымі навыкамі ў сваёй галіне ведаў, каб паспяхова канкурыраваць на рынку працы, 31% разлічваюць на свае сілы і вераць у поспех, і 25% упэўнены ў паспяховым працаўладкаванні, паколькі ўжо маюць досвед працы па сваёй спецыяльнасці.

Сярод усіх апытаных працуюць у цяперашні час 45% рэспандэнтаў. Для 40% з іх працоўнае месца, якое яны займаюць, з'яўляецца першым, для 29% — другім. 25% рэспандэнтаў змянілі два-тры месцы працы, і каля 2% рэспандэнтаў паспелі змяніць ужо больш як шэсць месцаў працы.

Па крытэрыях ацэнкі свайго цяперашняга месца працы менш за ўсё моладзь задаволена магчымасцямі атрымання зніжак і бясплатнага навучання па месцы працы (34%), магчымасцю прасоўвання па кар'ернай лесвіцы (20%) і ўзроўнем прэстыжу сваёй прафесіі (14%). Адносінамі ў калектыве задаволеныя 60% апытаных, адносінамі з кіраўніцтвам — 65% і зручнасцю размяшчэння офіса — 56%.

Каля 31% працуючых рэспандэнтаў знайшлі месца працы за некалькі дзён, амаль для такой жа колькасці спатрэбіўся месяц, 20% апытаных шукалі яго каля 2—3 месяцаў, а 11% — каля паўгода.

Сярод апытанай працоўнай моладзі 38% хацелі б змяніць сваё цяперашняе месца працы, а 49% не хацелі б яго змяняць (астатнія не змаглі даць упэўнены адказ)

Палова працуючых рэспандэнтаў (50%) працуюць па сваёй спецыяльнасці, 27% — не па сваёй спецыяльнасці, але ў той жа прафесійнай галіне, 23% працуюць у сферы, цалкам адрознай ад сваёй адукацыі. Самымі частымі прычынамі, чаму яны працуюць не па спецыяльнасці, рэспандэнты называюць адсутнасць вопыту работы па спецыяльнасці, які патрабуюць наймальнікі (33%), нізкую аплату працы ў гэтай галіне (29%), адсутнасць вакансіі (19%) і нежаданне працаваць па сваёй спецыяльнасці (15%).

Крыху менш за палову працуючых рэспандэнтаў знайшлі сваё месца працы па парадах знаёмых (49%). Самастойна выйшлі на работадаўца, або наймальнік сам прапанаваў працу, 30% рэспандэнтаў Каля 22% знайшлі месца працы, дзякуючы інтэрнэт-рэсурсам для пошуку працы. Найменш запатрабаванымі сродкамі пошуку работы сярод моладзі з'яўляюцца кадравыя агенцтвы, аб'явы ў друкаваных СМІ і рэклама ў грамадскіх месцах.

Найбольш важнымі характарыстыкамі работы для ўдзельнікаў апытання з'яўляюцца ўзровень заработнай платы (9 з 10 балаў), сяброўскі калектыў (8 з 10 балаў), магчымасць для самарэалізацыі (7 балаў) і магчымасць кар'ернага росту (7 балаў).

Паспяховае працаўладкаванне, на думку апытаных рэспандэнтаў, залежыць ад шэрагу крытэрыяў, найбольш значнымі сярод якіх з'яўляюцца досвед работы (57%), якасная адукацыя (54%), схільнасць да прафесійнай галіны, талент (45%), сувязі ў прафесійных колах (35%), харызма і знешняя прывабнасць (30%).

Удзельнікі апытання лічаць, што ў большай ступені на поспех чалавека ў жыцці ўплывае ўменне кантактаваць з людзьмі (60%), узровень адукацыі (51%), прыроджаныя фізічныя і псіхічныя якасці (48%), талент, адоранасць (44%), сіла волі (44%). У меншай ступені на поспех чалавека ў жыцці ўплывае месца яго нараджэння (11%) і знешнасць (20%).

Нагадаем, што Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў кожны тыдзень па серадах праводзіць прома-акцыю па інфармаванні маладых людзей аб магчымасцях працаўладкавання ў перыяд трэцяга працоўнага семестра «Выбіраем студатрад», які ў гэтым годзе праходзіць пад слоганам «Праца — гэта крута!»

Акрамя таго, з просьбай аб аказанні садзейнічання ў працаўладкаванні можна звяртацца і на «гарачыя лініі», якія створаны пры тэрытарыяльных камітэтах БРСМ для аказання дапамогі ў працаўладкаванні маладым людзям, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі.

**Тэлефоны «гарачых ліній»: у Брэсце — 8 (0162) 21 14 47, Віцебску — 8 (0212) 42 68 87, Гомелі — 8 (0232) 57 14 00, Гродне — 8 (0152) 77 02 50, Мінскай вобласці — 8 ( 017) 289 15 28, Магілёве — 8 (0222) 76 67 14, Мінску — 8 (017) 284 85 54.**

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# ЗДАРОВЫ ПАДЫХОД




**У аўтобусе падслухала размову студэнтак. Адна з іх — зграбная дзяўчына з прыгожымі нагамі — расказвала, што вырашыла сур'ёзна заняцца сваім целам (вясна як-ніяк). На пытанне сяброўак «Навошта?» тлумачыла: лічба на вагах ёй падабаецца, а вось як выглядае жывот у сукенцы — не. «Гэта сапраўдная катастрофа», — паскардзілася яна аднакурсніцам.**

Вы ж таксама заўважалі, што зграбныя дзяўчаты часта незадаволеныя сваёй знешнасцю? У суседняй Польшчы якраз праводзілі апытанне на гэтую тэму: аказалася, што кожнай пятай жанчыне не падабаецца, як яна выглядае. Прычым палова тых, хто лічаць сябе тоўстымі, насамрэч не маюць праблем з лішняй вагой. Адкуль тады столькі самакрытыкі? Зразумець тонкую дзявочую псіхалогію складана нават самім дзяўчатам, але часткова справа ў ідэалах, якія мы бачым у сацыяльных сетках штодзень. Пасля шэрагу фота «фітаняшак» пачынае здавацца, што ўсе навокал выглядаюць, як мадэлі на вокладкы глянцавага часопіса. Што насамрэч далёка не так. І размова нават не пра фоташоп. Нядаўна жанчыны, якія займаюцца фітнесам, правялі флэшмоб: выклалі звычайныя здымкі і тыя, дзе яны ўдала пазіруюць. Чым чарговы раз даказалі: ідэальнай фігуры не існуе, а ўцягнуты жывот і правільны ракурс амаль любую дзяўчыну зробяць прыгажуняй.

Хоць прыгажосць — паняцце адноснае. Для некаторых жанчын і «жалезны» Арні — эталон. Іх погляды на ідэал, праўда, мала хто падзяляе (бодзібілдарак папракаюць, што яны больш падобныя да мужчын), але саміх атлетак гэта не спыняе. Яны ганарацца сваёй празмернай мышачнай масай і не лічаць шырокія плечы недахопам.

Першыя (зграбныя і незадаволеныя) і другія (бодзібілдаркі) у нечым падобныя. Пачаць трэніравацца іх прымушае жаданне змяніць сваю знешнасць да лепшага (у іх уяўленні). А вось пра карысць для здароўя яны думаюць у апошнюю чаргу. І дарма. Адзін псіхолаг расказваў, што пры ацэнцы знешнасці мужчыны падсвядома ўлічваюць, наколькі здаровай выглядае жанчына.

Дарэчы, ведаеце, чаму мужчыны больш за жанчын матываваныя займацца фітнесам? Першыя бягуць у трэнажорку ад хвароб. Ёсць меркаванне, што страх смерці насамрэч адзіная прычына, якая можа прымусіць займацца сабой рэгулярна. Так, сярод наведнікаў фітнесклубаў дзяўчат можа аказацца больш, але як толькі пляжны сезон скончыцца, колькасць «фітаняшак» (у зале, але не ў Інстаграме) рэзка зменшыцца. У мужчын жа з трэніроўкамі складваюцца больш доўгатэрміновыя адносіны.

Каб фізічныя нагрузкі пайшлі на карысць здароўю, яны павінны быць умеранымі. Не трэба адразу прысядаць са штангай (падумайце пра свае калені і пазваночнік) — паспрабуйце спачатку зрабіць гэта практыкаванне з больш лёгкімі гантэлямі. Бег на высокай хуткасці на мяжы магчымасцяў таксама пакіньце прафесійным спартсменам. Тым больш для таго, каб «спальваўся» тлушч, пульс павінен быць у дыяпазоне 60—80 працэнтаў ад максімальнага (максімальна дапушчальны пульс вылічаецца як 220 мінус узрост).

Асабліва не раю занадта шчыраваць навічкам. Разумею, што вынікі ў люстэрку хочацца ўбачыць як мага хутчэй, але... Літаральна ўчора назірала ў трэнажорнай зале, як пара вырашыла самастойна пазаймацца модным цяпер кросфітам (што б там ні казалі, гэты кірунак разлічаны на тых, хто ў фітнесе не першы дзень). Пад секундамер рабілі скокі на высокую тумбу. На трэцім разе дзяўчына не разлічыла сілы і моцна пабіла калена. Ці варта тлумачыць, што астатнюю частку трэніроўкі яна ледзь дабыла, выконваючы самыя простыя практыкаванні.

Што да ідэалаў... Мода, ведаеце, недаўгавечная. Сёння ў модзе прэс, заўтра — пышныя формы (а што, улічваючы папулярнасць мадэляў plus size, цалкам магчыма). А вось здароўе ў цане ў любыя часы. Таму пастарайцеся не страціць яго на шляху да прыгажосці.

*Ёсць ідэя*

# Ад «Азбукі маленькага беларуса» — да «Вікінга»

**Галоўны прыз — грант на развіццё свайго праекта ў памеры 11 500 рублёў — атрымаў у фінале рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» выкладчык Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Арцём Марозаў. Такім чынам афіцыйны партнёр конкурсу — унітарнае прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыс Беларусь» — заахвоціў ідэю пажарнага ручнога ўніверсальнага камбінаванага ствала «Вікінг».**




Арцём Марозаў з камандай аднадумцаў.

У фінале конкурсу «100 ідэй для Беларусі», які прайшоў адразу на дзвюх пляцоўках, — у Нацыянальнай акадэміі навук і тэхнапарку БНТУ — былі прадстаўлены больш як 120 праектаў маладых інаватараў і рацыяналізатараў. А ўвогуле ў 2016 годзе да арганізатараў паступіла больш за дзве тысячы заявак на ўдзел у конкурсе, адбыліся 340 раённых, 6 абласных і мінскі гарадскі этапы конкурсу!

У фінале перад экспертным журы стаяла няпростая задача — вызначыць 10 пераможцаў у асноўных намінацыях. Абарона праектаў праходзіла ў фармаце start-up цягам усяго дня.

У намінацыі «Энергетыка і энергаэфектыўнасць, атамная энергетыка» перамог праект прадстаўнікоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі «Перспектыўная сістэма рэгулявання напружання на аснове штучнага інтэлекту для самалётаў канцэпцыі all electric aircraft».

У намінацыі «Аграпрамысловыя тэхналогіі і вытворчасць» лепшым стаў праект «З'еш мяне». У намінацыі «Прамысловыя і будаўнічыя тэхналогіі і вытворчасць» — праект «Новая эканомналегіраваная сталь для зубчастых колаў каробкі перадач аўтатрактарнай тэхнікі».

Маладыя навукоўцы з Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук з даследаваннем генетычных прычын невынošвання цяжарнасці сталі лепшымі ў намінацыі «Медыцына, фармацыя, медыцынская тэхніка». У гэтай жа намінацыі перамагла і «Пальчатка-трэнажор для рэабілітацыі пасля інсульту». А ў намінацыі «Сацыяльная сфера» перамог праект «Азбука маленькага беларуса».

«Залог паспяховага развіцця Беларусі — у рэалізацыі маладзёжных ідэй і інавацый, — падкрэсліў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ**, які наведаў фінал конкурсу «100 ідэй». — І калі ў нас ёсць такая моладзь, мы можам глядзець у будучыню з аптымізмам».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Дыскусія*

# ПРАКТЫКА Ў АСНОВЕ

**Для Аляксандра КАНЮКА, Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, візіт у Акадэмію кіравання не ў навіну: ён ужо каля трох гадоў выкладае ў гэтай ВНУ і ведае, чым цікавіцца студэнцкая моладзь. Асаблівасцю сустрэчы стаў фармат — круглы стол, падчас якога абмяркоўваліся перспектывы развіцця пракурорскай дзейнасці ў Беларусі. Ён прайшоў у рамках праекта БРСМ «Адкрыты дыялог».**

Аляксандр Канюк адзначыў добрую матывацыю студэнтаў, якая дапамагае працаваць і выкладчыкам. Да таго ж у яго ёсць і асабісты інтарэс: «Шэсць гадоў таму на нашым полі з'явіўся новы гулец — Следчы камітэт. Улічваючы, што пракуратура перадала такую важную функцыю, як следства, паўстала праблема прадметнага выкладання. Калі раней пракуроры актыўна расследавалі крымінальныя справы, то цяпер гэтага няма. Але мы разумеем, што неабходна, каб профільныя дысцыпліны выкладалі практыкі».

Ужо ёсць папярэдняя дамоўленасць рыхтаваць пракурораў у Акадэміі МУС. Дарэчы, цяпер старшакурснікі юрыдычных спецыяльнасцяў могуць пайсці ў Інстытут пазаштатных супрацоўнікаў, створаны пры пракуратуры. Там яны атрымліваюць вопыт, а зацікаўленыя — працоўнае месца.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

*Свой выбар*

# ЗНАЙСЦІ ЧАЛАВЕКА

## Часта гэта азначае — выратаваць

**Колькасць людзей, якія гатовы быць карыснымі для іншых, штогод павялічваецца. Добраахвотнікаў аб'ядноўвае адно — жаданне прыйсці на дапамогу тым, хто мае ў ёй патрэбу.**

Крысціна Басава працуе спецыялістам па продажах і маркетынгу на сталічным мясаперапрацоўчым прадпрыемстве. А ў свой вольны ад работы час дзяўчына з'яўляецца каардынатарам ляснога пошуку пошукава-выратавальнага атрада «Анёл».

— Гісторыя майго валанцёрства пачалася тры з паловай гады назад. Аднойчы я ўбачыла арыенціроўку па пошуку пажылога мужчыны ў раёне ваеннага гарадка. Чалавек сышоў у невядомым напрамку і не вяртаўся ўжо другія суткі. Было вядома, што раней у яго быў інсульт, — расказвае Крысціна. — Менавіта той выпадак падштурхнуў мяне паехаць на пошукі. Я паспрабавала, паглядзела, як гэта адбываецца, і зразумела, што гэта менавіта тое, чым хачу займацца.

Усе па-рознаму адрэагавалі на рашэнне Крысціны стаць валанцёрам. Адны падтрымалі, другія — не. Пастаянна задаюць пытанне, навошта ёй гэта патрэбна. Але пры гэтым цікавяцца, як усё прайшло, дзе шукалі чалавека і чым усё скончылася. Сябры таксама ўжо прывыклі, нават перасталі крыўдзіцца, калі кампанія дамаўляецца правесці час разам, а замест гэтага Крысціна едзе ў лес на пошукі.

У абавязкі каардынатара ляснога пошуку ўваходзіць многае. «Нам прыходзіць заяўка на пошук, адміністратар яе апрацоўвае. Або паступае арыенціроўка з міліцыі, таму што мы супрацоўнічаем з МУС. Збіраецца пошукава-выратавальная група, абгаворваюцца час і месца, куды мы едзем». У Крысціны ўжо павінен быць прыкладны спіс задач, або на месцы яна глядзіць, якую работу патрэбна будзе правесці, і размяркоўвае людзей. Іх колькасць заўсёды розная: бывае многа, бывае — мала. Але валанцёры стараюцца максімальна выкарыстаць рэсурсы. Потым каардынатар пошуку ставіць канкрэтныя задачы, напрыклад, прайсці і праверыць лінейныя арыенціры або мясцовасць (лес, поле, кустоўе, балота), праінфармаваць насельніцтва ў канкрэтных населеных пунктах.

Кожны чалавек, якога знайшлі валанцёры, — гэта асобная гісторыя. «Аднойчы мы шэсць дзён шукалі мужчыну ў Валожынскім раёне. Аблазілі ўсю прылеглую тэрыторыю, у райцэнтры агледзелі практычна кожную фуру. На шостыя суткі амаль страцілі надзею яго знайсці. І тут адзін сведка паведаміў, што бачыў чалавека, які падыходзіў пад апісанне. Мужчыну мы знайшлі. Ён быў у дэпрэсіі і сышоў з дому, каб пабыць аднаму. Ці вось яшчэ выпадак. Шукалі бабулю. Знайшлі толькі ў 4.40 ранку. Амаль кіламетр неслі яе з лесу на насілках да дарогі», — прыгадвае Крысціна эпізоды з валанцёрскага жыцця.

Дзяўчына гаворыць, што ганарыцца сваёй работай і сваімі таварышамі, якія займаюцца гэтай нялёгкай справай. За тры з паловай гады, якія Крысціна прысвяціла валанцёрству, пошукава-выратавальны атрад «Анёл» дапамог вярнуцца дадому многім людзям. Суразмоўца з упэўненасцю гаворыць, што знайшла сваё прызванне.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**



*Таленты — побач!*

# Максімаў шлях да адкрыццяў

**Падчас правядзення VIII Рэспубліканскага конкурсу навукова-тэхнічнай творчасці навучэнскай моладзі «Тэхнаінтэлект» яго ўдзельнікамі стала больш за 200 хлопцаў і дзяўчат з усіх абласцей краіны. А перамог у ім вучань 10 класа дзяржынскай гімназіі №1 Максім Акуліч. Ён атрымаў дыплом першай ступені за работу ў секцыі «Матэрыялы ў тэхніцы».**




Вось што кажа сам Максім пра сваю перамогу:

— Пра конкурс расказала наш завуч Алена Анатолеўна Кулічкоўская, прапанавала паўдзельнічаць, і я пагадзіўся. Фізіка мяне цікавіць ужо даўно, гэта не першы мой конкурс, але, нягледзячы на гэта, падрыхтоўка праходзіла доўга і старанна. Мая тэма называлася «Нанаакумулятары».

***— Максім, а чаму менавіта яна?***

— Незадоўга да таго, як даведаўся пра конкурс, прачытаў даволі цікавы артыкул у адным з навуковых часопісаў. Там апісвалася, як адна замежная фірма стала выпускаць новы від акумулятараў, якія каштуюць менш, але працуюць не горш за звычайныя. Артыкул вельмі спадабаўся, але я адклаў яго на потым. І вось такі выпадак. Я адразу, не задумваючыся, вызначыўся з тэмай для сваёй работы.

***— І чым жа цябе так зацікавіў той акумулятар?***

— Ён на аснове графену, мадыфікацыі вугляроду. Такі акумулятар мае меншую масу, габарыты і лепшыя характарыстыкі ў параўнанні са звычайным літый-іонным. Каб яго зрабіць, я прачытаў шмат кніг і інтэрнэт-крыніц, дзе апісвалася, як можна атрымаць графен. Купіў стары літый-іонны акумулятар, ачысціў яго пласціны ад электраліту. Самым цяжкім этапам было пры дапамозе DVD-прывада камп'ютара атрымаць графен на электродах разабранага акумулятара. Ну, а асноўным этапам стала зборка новага з выробленых электродаў з нанапакрыццем графенам. У завяршэнне сваіх эксперыментаў я сабраў яшчэ адзін акумулятар па аналагічнай тэхналогіі, але з палепшанай герметызацыяй. Работа заняла ў мяне прыкладна месяц. А вось пісьмова аформіць работу было значна лягчэй. Ва ўсім гэтым мне дапамагаў мой кіраўнік Аляксей Ігаравіч Філіповіч, без якога мне было б вельмі складана.

***— Як ты абараняў свой праект? Што карыснага даў табе конкурс?***

— Калі шчыра, баяўся, што мне зададуць нейкае пытанне, на якое я не змагу адказаць. Але баяўся дарэмна. Конкурс праходзіў у тры этапы (раённы, абласны і рэспубліканскі). У першых двух я стаў пераможцам, таму накont трэцяга не так моцна хваляваўся. Вядома, мне хацелася перамагчы, але я і так быў шчаслівы, што дайшоў да фіналу. Калі пачалі аб'яўляць вынікі і назвалі прозвішчы тых, хто атрымаў дыпломы другой і трэцяй ступені, стаў трохі перажываць. Калі ж сказалі, што перамог я, майму шчасцю не было мяжы. Камісія, якая абвяшчала вынікі, прапанавала мне ліцэнзаваць маю прыладу, а таксама разгледзець пытанне па супрацоўніцтве з прадпрыемствам МАЗ. Пытанне пра ліцэнзію я разглядаю, але не вельмі хочацца траціць шмат часу на гэта. А што тычыцца прапановы адносна МАЗа, то гэта пытанне прыйдзецца адкласці да майго паўналецця. Да ўсяго іншага, мне падарылі карысныя прызы, якія спатрэбяцца і ў вучобе, і ў маіх далейшых эксперыментах. Яшчэ мне запомніліся экскурсіі, якія нам праводзілі пасля конкурсу. Увесь час, праведзены там, пайшоў мне на карысць. Я даведаўся шмат новага і цікавага.

Застаецца толькі дадаць, што Максім прыме ўдзел у фінале конкурсу навукова-тэхнічнай творчасці навучэнцаў Саюзнай дзяржавы «Таленты XXI стагоддзя», які адбудзецца з 17 па 20 мая ў НДЦ «Зубраня». Пажадаем яму поспеху!

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**вучаніца 11 класа гімназіі №1 г. Дзяржынска.**

# СІЛА ЦЯГІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Калі адбываецца паломка, можна адразу ж замяніць машыну адной з трох іншых, што стаяць у дэпо. На больш дробныя непаладкі машыністы афармляюць заяўкі — такія праблемы таксама вырашае брыгада цэха. Усяго ў ёй працуе чатыры слесары і адзін слесар-электрык.

— Мая спецыяльнасць, калі можна так сказаць, памежная, — тлумачыць малады спецыяліст. — У цеплавозах гэтага тыпу шмат механікі, вырашэннем праблем з ёй займаюцца мае калегі — слесары і я. А вось калі справа даходзіць да электрыкі (якой тут, у прынцыпе, няшмат), то гэта ўжо выключна мая сфера адказнасці. У прынцыпе, праблем хапае, як-ніяк гэтыя цеплавозы распрацаваны амаль паўстагоддзя таму. Некалькі гадоў назад іх адганялі на капітальны рамонт у Лідскае лакаматыўнае дэпо, але ўсё адно паломкі здараюцца. Тым не менш усю тэхніку падтрымліваем у належным стане. Імкнёмся абыходзіцца сваімі сіламі: калі раней практычна заўсёды звярталіся ў рамонтны цэх па дэталі і дапамогу, то цяпер хапае досведу працаваць аўтаномна.

Аляксандр прызнаецца, што пасля трамвайнага дэпо па першым часе было цяжка перастроіцца на новы від работы. Асабліва напачатку — хлопец даходзіў да ўсяго «сваім розумам», часам здараліся і памылкі. Нават праз чатыры гады ён не рызыкуе сцвярджаць, што ведае пра «начынне» цеплавоза ўсё — машына вельмі складаная і дасканала ў ёй разбірацца можа толькі вопытны спецыяліст.

**Навыкі «масавіка-зацейніка» спатрэбіліся на новым месцы работы — ён удзельнічае амаль ва ўсіх культурна-масавых мерапрыемствах на заводзе. А яшчэ хлопец — актывіст валанцёрскага атрада «Сэрца «Паліміра».**

— Калі паломак і заявак на рамонт няма, гэта не значыць, што брыгада адпачывае, — кажа Аляксандр. — Мы штодзень праводзім агульны агляд усіх вузлоў тэхнікі: падцягваем балты, правяраем працаздольнасць агрэгатаў. Акрамя таго, над вырашэннем некаторых праблем трэба працаваць не змену і не дзве — тыдзень, а часам і больш. Ёсць і папяровая работа, бо кожны цеплавоз мае сваю «гісторыю хваробы» — гэта вахтавы журнал, у які заносяцца ўсе рамонтныя работы, што праводзяцца з машынай. Я вяду такі дакумент выключна па праблемах з электраабсталяваннем. Часам гэта вельмі дапамагае, калі сутыкаешся з праблемай, якую ўжо вырашаў некалькі гадоў таму.

Графік у лакаматыўным дэпо звычайны: пяць дзён на тыдзень, рабочы дзень з 8 гадзін раніцы. Па словах Аляксандра, яго заробак перавышае сярэдні па горадзе. «Не шыкуем, вядома, але і не бядуем», — смяецца хлопец.

— Калі вы лічыце, што слесар — гэта рабацяга, які больш нічым не цікавіцца, то памыляецеся, — кажа Аляксандр. — У нас надзвычай творчы цэх! Напрыклад, на дзень нараджэння завода штогод праводзіцца конкурс роставых фігур па пэўнай тэматыцы — трэба з падручных матэрыялаў зрабіць адмысловую ляльку, а потым прайсці этап творчай абароны праекта. Летась мы сабралі з металу, непатрэбных дэталяў і тканіны мядзведзя з мультфільма «Маша і Мядзведзь», ён вельмі спадабаўся і журы, і ўдзельнікам свята.

У школьныя часы Аляксандр гуляў у КВЗ. Асаблівага поспеху каманда не здабыла, але навыкі «масавіка-зацейніка» спатрэбіліся на новым месцы работы — ён удзельнічае амаль ва ўсіх культурна-масавых мерапрыемствах на заводзе. А яшчэ хлопец — актывіст валанцёрскага атрада «Сэрца «Паліміра». За апошні час больш за ўсё яму запомніўся візіт у Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі — там знаходзіўся хворы на ДЦП хлопчык Прохар, у бацькоў якога не было грошай на набыццё інваліднага крэсла. Атрад перадаў для яго куплі атрыманы за перамогу ў адным з валанцёрскіх конкурсаў грашовы прыз.



Фота Надзеі БУЖАН.

— Нашы любімыя мерапрыемствы па-за працай — гэта турзлёты для супрацоўнікаў і іх сем'яў, — сцвярджае хлопец. — Самы маштабныя праводзіць пад Стоўбцамі Беларускі прафсаюз работнікаў хімічнага, горнага і нафтавага адгалінаванняў прамысловасці. Штогод мы абавязкова яго наведваем — купаемся ў Нёмане, удзельнічаем у творчых конкурсах (гэта якраз мой профіль, я прыдумляю нашай камандзе КВЗ-шныя «візітоўкі»), спартыўных спаборніцтвах і проста адпачываем.

Аляксандр родам з Наваполацка, але некалькі гадоў таму пераехаў у Полацк разам з жонкай. Абранніца хлопца працуе ў Полацкім кадэцкім вучылішчы педагогам-арганізатарам. У пары ўжо ёсць і дзіця — пяцігадовая дачка. Менавіта яна займае ўвесь вольны час маладога бацькі — здаецца, што дзень у яго распісаны ці не па хвілінах!

— Наша Лізавета па маіх слядах наўрад ці пойдзе, — смяецца Аляксандр. — Ёй падабаецца маляваць і гуляць у лато, а да электрыкі цягі пакуль не заўважылі. У прынцыпе, у Полацку ёсць усе магчымасці для дзіцяці. У нас «пад бокам» гандлёвы цэнтр з забаўляльнымі пляцоўкамі, катком, цацкамі і піцэрыяй — ёй для шчасця больш нічога і не трэба пакуль.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by
*Мінск — Наваполацк — Мінск.*

*Камертон настрою*

# ЗУСІМ НЕ ЖОРСТКАЯ МОЛАДЗЬ,

## ці У пошуках сябе



Артур Цымбал *(злева)* і Пётр Федзічаў.

**Песні мінскага дуэта «The Violent Youth» можна знайсці ў многіх папулярных музычных суполках у сацыяльных сетках. Але паверыць у тое, што гэта запісы нашых землякоў, досыць складана. Бездакорнае англамоўнае гучанне тэкстаў у спалучэнні з простымі рамантычнымі мелодыямі сінтэзатара — галоўная рыса дуэта, якая робіць яго непадобным на астатніх беларускіх музыкантаў-пачаткоўцаў.**

Артур Цымбал (вакал, сінтэзатар) — настаўнік англійскай мовы, Пётр Федзічаў (гітара) — асвятляльнік на кінастудыі. Па іх словах, яны вядуць жыццё звычайных мінскіх хлопцаў узростам крыху за дваццаць: ходзяць штодня на працу, у выхадныя любяць адпачыць дзе-небудзь у горадзе. А музыка для іх — сур'ёзнае хобі, на якое яны трацяць не толькі вольны час, але і немалыя грошы. Прынамсі, два паўнавартасныя альбомы і некалькі сінглаў былі запісаны выключна на ўласныя зберажэнні ўдзельнікаў дуэта.

— У любой справе галоўнае — жаданне і шчырая адданасць таму, што робіш. У нас нават няма музычнай адукацыі, мы вучыліся іграць на інструментах самастойна, але хіба сёння гэта мае значэнне? — разважае 23-гадовы Артур.

— Я заўважаю, што ў многіх маіх равеснікаў шаблоннае мысленне наконт уласнага жыцця: школа — універсітэт — праца. Яны баяцца рызыкаваць дзеля сваіх інтарэсаў, — падхоплівае думку 21-гадовы Пеця. — Мне здаецца, што, калі ўзнікае нейкае жаданне, трэба кідаць усе сілы на яго ажыццяўленне. Ці ёсць у нас гарантыя, што аднойчы мы станем «суперзоркамі»? Няма, але мы робім усё магчымае для гэтага.

Так, хлопцы адкладвалі грошы з кожнай зарплаты на запіс другога альбома «Discotheque» (ён выйшаў у лістападзе 2016 года). «А як інакш, калі няма спонсараў, але ёсць мара?» — разважаюць яны. Затое цяпер іх можна паслухаць не толькі на выступленнях, але і ў любы час, бо ўсе запісы ёсць у інтэрнэце.

Дарэчы, менавіта сеціва дапамагло маладым музыкантам знайсці сваіх слухачоў. З-за таго, што іх песні нельга аднесці ні да аднаго з класічных музычных кірункаў, адразу выступаць перад публікай яны б не змаглі.

— Складана дакладна вызначыць стыль нашай музыкі — гэта і сінці-поп, і індзі-поп, і так званая новая хваля, папулярная ў 1980-х. Карацей, у нашых кампазіцыях сканцэнтравалася ўсё тое, за што мы любім творчасць іншых гуртоў, — расказвае вакаліст. — Прыемна, што знайшліся тыя, каму творчасць дуэта прыйшлася даспадобы. І хоць фанаты нас пакуль што не праследуюць, ёсць пэўная колькасць хлопцаў і дзяўчат, якія прыходзяць на ўсе нашы выступленні.

Што цікава, песні на англійскай мове Артур (ён аўтар усіх тэкстаў) піша не спецыяльна: «Можа, з-за таго, што на рабоце па сем гадзін у дзень даводзіцца размаўляць па-англійску, падчас напісання чарговага тэксту ў галаву лезуць радкі толькі на замежнай мове». У любым выпадку сучасная беларуская моладзь — а дуэт арыентуецца ў першую чаргу на маладых слухачоў — разумее тэксты песень. Таксама музыканты адзначаюць, што англійская мова — гэта шанц быць пачутымі не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Напрыклад, зусім нядаўна іх кампазіцыя гучала ў ратацыі перуанскага радыё.

— Нашы песні пра тое, што хвалюе моладзь, — каханне і пошукі сябе ў гэтым свеце. Што да назвы (перакладаецца з англійскай як «жорсткая моладзь»), то яна зусім не сімвалічная, выбралі мы яе выпадкова. Гэта была першая фраза, якая трапіла мне на вочы ў момант, калі трэба было даць назву дуэту. Мы з Пецем зусім не жорсткія, хутчэй, наадварот, светлыя і пушыстыя! — дзеліцца Артур.

За плячыма ў хлопцаў ужо нямала выступленняў, але кожны раз перад выхадам на сцэну яны ўсё адно хвалююцца і таму трапляюць у смешныя сітуацыі падчас канцэртаў. Артур, напрыклад, часта забывае пра мікрафон, які стаіць каля сінтэзатара, і б'ецца аб яго галавой.

— А я ўвогуле на першым канцэрце адыграў адну песню на выключанай гітары, — успамінае са смехам Пеця. — Так баяўся памыліцца, што нават нічога не чуў! Затое цяпер мне навука на ўсё жыццё: правяраць кожны раз, ці падключаны інструмент.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Дарожкі настальгіі*

# САЎНДТРЭК ДА ЖЫЦЦЯ,

## або Як «вініл» вяртае сабе папулярнасць

**Гасцёўня ў кватэры жыхара Фаніпаля Мікалая ДРАЖЫНА незнаёмым з ім людзям больш нагадвае студыю гуказапісу: нізкая столь пакрыта спецыяльнымі гукапаглынальнымі матэрыяламі, у кутах пакоя знаходзяцца адмысловыя «басовыя пасткі», а прайгравальнік стаіць на скрыні з кварцавым пяском. Да такіх кардынальных канструктарскіх крокаў гаспадара жылля падштурхнула любоў да музыкі. Справа ў тым, што ў век «лічбы» Мікалай аддае перавагу аналагаваму гуку, у прыватнасці, вінілавым пласцінкам. Пра сваю музыкальную калекцыю і вяртанне моды на «вініл» ён расказаў нашым карэспандэнтам.**

— Адразу заўважу, што я не калекцыянер у традыцыйным сэнсе гэтага слова, — зазначае мужчына. — Філафаністы збіраюць усё, ганяюцца за рэдкімі экзэмплярамі, я ж маю на паліцах толькі тую музыку, якую слухаю сам. Таму ўсё, што вы можаце тут пабачыць, калекцыяй называць не зусім правільна. Гэта саўндтрэк да майго жыцця — усё тое, што я збіраю прыкладна з пачатку 90-х гадоў.

У «сціплай» фанатэцы меламана — больш за дзве тысячы пласцінак, а яшчэ прыкладна паўтары тысячы кампакт-дыскаў. Ёсць і запісы на «бабінах». Сам Мікалай называе сябе «ўсёедным» — яму падабаецца музыка розных жанраў, але больш за ўсё — класічны рок, джаз, блюз, фанк. У абавязковым парадку ў калекцыі ёсць поўныя дыскаграфіі «ікон» накшталт The Rolling Stones ці Led Zeppelin. Але хапае і «настальгічнай» савецкай поп-музыкі, нямецкага краўт-рока ці нават рэгі. Вельмі вялікая калекцыя сучасных беларускіх аўтараў: ад Данчыка і «Песняроў» да «Ляпіса Трубяцкога» і Ulis. Адзіны кірунак, які яго не «чапляе», — агрэсіўная і цяжкая музыка.

— Усё, вядома, ідзе з дзяцінства, — кажа Мікалай. — У майго дзядулі, Івана Мікалаевіча, была лямпавая радыёла. На ёй мы слухалі пласцінкі (скажам, раннюю Алу Пугачову, якая мне і цяпер падабаецца, бо гэта вельмі якасная поп-музыка), а яшчэ, зачыніўшы вокны, — «Голас Амерыкі» і іншыя «падпольныя» радыёстанцыі. З таго часу я, па-першае, палюбіў музыку, а, па-другое, прывык да пэўнага гуку — лямпавага. У двух словах я б апісаў яго як больш натуральны — ён бліжэйшы да «жывога», канцэртнага гучання. Таму цяпер уся апаратура ў мяне менавіта лямпавая.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Прайгравальнік сваімі рукамі? Не праблема!

«Пласцінка — гэта матэрыяльнае ўвасабленне музыкі — тое, што можна патрымаць у руках, і чаго не хапае электронным носьбітам, — дзеліцца сваімі думкамі суразмоўца. — Акрамя таго, нярэдка і сам «вініл» становіцца творам мастацтва. Прыклад — дзявяты студыйны альбом сэра Элтана Джона, дызайн вокладкі якога за шалёныя грошы стварыў славуты графік Алан Олдрыдж. У самім канверце нават знаходзіцца асобны постар з сюррэалістычным малюнкам».

Часам за «вінілам» хаваюцца гісторыі ці легенды. І тут па прыклад хадзіць далёка не трэба — Мікалай дэманструе трэцюю студыйную пласцінку «Песняроў», на якой размешчана фота калектыву ў поўным складзе. Пры афармленні выкарыстоўваўся незвычайны шрыфт з вельмі буйной літарай «С», аднак пільнае вока заўважыць, што з-пад яе выглядае край доўгай спадніцы. За надпісам схавана адзіная жанчына, што была ў складзе ансамбля, — Людміла Ісупава. Існуюць розныя версіі (ці, правільней сказаць, чуткі), чаму афарміцелі зрабілі менавіта так, але факт у любым выпадку цікавы.

— Сказаць адназначна, колькі каштуе такое захапленне, цяжка, — сцвярджае Мікалай. — Пакупка і продаж «вінілу» — гэта як пошук артэфактаў. У мяне няма ніякага плана па набыцці. Звычайна шукаю пласцінкі па аб'явах у інтэрнэце, тэлефаную людзям, езджу хоць на «край свету», абы толькі паглядзець на калекцыю сваімі вачыма і нешта выбраць. Тым больш, што ў Беларусі дастаткова шмат аматараў «вінілу». Многіх я ведаю яшчэ па клубах філафаністаў 1990-х. Што датычыцца цэн, то, як у савецкія часы, так і цяпер, найбольш каціруюцца фірменныя замежныя пласцінкі — яны каштуюць у сярэднім 30 рублёў. «Вінілы», якія выпускала фабрыка «Мелодыя», не маюць высокай каштоўнасці, у меламанаў слухаць іх заўсёды лічылася «не камільфо». Хоць і з гэтага правіла бываюць выключэнні. Напрыклад, малатыражныя выданні некаторых авангардных калектываў. Гэта могуць быць групы, якія выконвалі джаз-фанк, фры-джаз і іншыя «андэграўндныя» стылі. Вось такія савецкія пласцінкі могуць патрабаваць сур'ёзных выдаткаў.

Дарэчы, кошт пласцінкі залежыць не толькі ад выканаўцы, краіны паходжання ці ўнікальнасці выдання. Тэхнічны працэс выпуску «вінілаў» прадугледжвае, што найлепшы гук атрымаецца на носьбітах з самай першай партыі — так званым «першым прэсе». Існуе яшчэ «тэст-прэс» — заводскія пласцінкі без вокладкі, на «пятаку» якіх звычайна нават няма афармлення. У Мінску ёсць калекцыянер менавіта такіх, унікальных выданняў, але якіх шалёных грошай яны каштуюць, пэўна, не варта і тлумачыць. Ці вось яшчэ адзін прыклад — у 1966 годзе The Beatles выпусцілі ў Амерыцы альбом пад назвай Yesterday and Today, на вокладцы якога змяшчалася фота ўдзельнікаў гурта ў касцюмах мяснікоў і з кавалкамі мяса ў руках. З-за негатыўнай рэакцыі публікі тыраж у 750 тысяч экзэмпляраў тэрмінова знялі з продажу, але прададзеныя пласцінкі дагэтуль перакупляюць за сумы ў паўмільёна долараў.

Сваю любоў да музыкі Мікалай пераўтварыў у бізнес — некалькі гадоў таму адкрыў у сталіцы краму па продажы вінілавых пласцінак. Як сам прызнаецца, справы ідуць не надта бойка, хоць у суседніх сталіцах (тым жа Вільнюсе) усё зусім інакш. У Беларусі рух пакуль не настолькі вялікі. Тым не менш меламан адзначае, што цяпер сярод аматараў пласцінак з'явілася шмат моладзі.

— Зараз пачалася новая хваля папулярнасці «вінілу», — кажа Мікалай. — У Вялікабрытаніі летась прадалі больш музыкі на пласцінках, чым у лічбавым фармаце. Некалькі гадоў таму ў гэтай краіне аднавіўся вінілавы чарт. Практычна кожны сур'ёзны выканаўца цяпер выпускае альбомы не толькі ў «лічбе», але і на пласцінцы. Я, праўда, мяркую, што з цягам часу гэты трэнд таксама пойдзе на спад, — не думаю, што «вініл» зноў стане масавым. Ды і, шчыра кажучы, не надта хачу, бо гэта захапленне не для ўсіх.

Трэба заўважыць, што набыццё пласцінак — толькі адзін бок справы. Не менш важную ролю мае і апаратура, якая здымае з іх гук. У Мікалая гэта прайгравальнік, які ён зрабіў сваімі рукамі на базе швейцарскага Lenco. Пакінуў ад яго станіну, дадаў японскі гуказдымальнік, сам сабраў корпус, засыпаў у яго шрот для гашэння вібрацый... А яшчэ для праслухоўвання пласцінак патрэбны фонакарэктар і, вядома, калонкі. У мужчыны ёсць нават спецыяльная мыйка для «вінілу». «Наколькі далёка можа зайсці пагоня за ідэальным гукам? Усё залежыць ад кашалька і разумнага сэнсу», — смяецца меламан. Каштуе ўсё гэта нямалых грошай, але аматар-пачатковец можа знайсці неблагі прайгравальнік і за рублёў 300—500.

— Калі глядзець на гэта з філасофскага боку, то лічбавая музыка яскрава характарызуе эпоху, — лічыць Мікалай. — Многія цяпер ставяцца да мастацтва максімальна ўтылітарна: у інтэрнэце ўсё можна знайсці за лічаныя секунды ды яшчэ і бясплатна, можна пераключаць «трэкі», не даслухаўшы іх і да сярэдзіны. «Вініл» жа надае музычным творам каштоўнасць, падштурхоўвае чалавека быць больш пераборлівым, выхоўвае густ. У гэтым і заключаецца яго ўнікальнасць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Фаніпаль — Мінск.*

6 ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
4 05 2017 г.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 15 июня 2017 года проводит**

8-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 78 | Автоцистерна для ракетного горючего АЦГ-5-4320 с/о 474 на УрАЛ–4320 ш. 032294 дв. 582703 1985 г. *4 кат. 55016 км* | г. Полоцк, в/ч 55719 | 17 200 | 1 720 |
| 79 | Автоцистерна для ракетного горючего АЦГ-5-4320 с/о 268 на УрАЛ–4320 ш. 017460 дв. 765804 1983 г. *4 кат. 21401 км* | г. Полоцк, в/ч 55719 | 17 700 | 1 770 |
| 80 | Автоцистерна для ракетного горючего АЦГ-5-4320 с/о 180 на УрАЛ–4320 ш. 017092 дв. 666406 1983 г. *4 кат. 25970 км* | г. Полоцк, в/ч 55719 | 17 700 | 1 770 |
| 81 | Автоцистерна АЦ-5,5-4320М с/о 5951 на Урал–4320 ш. 103235 дв. 300991 1988 г. *4 кат. 62507 км* | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 6 000 | 600 |
| 82 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8903010 дв. 8854529 1989 г. *3 кат. 1152 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №694 1989 г. *4 кат. 576 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 83 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8903009 дв. 8904903 1989 г. *3 кат. 911 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №718 1989 г. *4 кат. 319 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 84 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8903015 дв. 8904720 1989 г. *3 кат. 1495 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №696 1989 г. *4 кат. 780 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 85 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8903020 дв. 029262 1989 г. *3 кат. 1158 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №720 1989 г. *4 кат. 432 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 86 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8901033 дв. 8851708 1989 г. *3 кат. 1251 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №702 1989 г. *4 кат. 4021,5 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 87 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 ДЕ9011006 дв. 9035111 1990 г. *3 кат. 1601 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №869 1990 г. *4 кат. 6102 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 88 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8901030 дв. 8849391 1989 г. *3 кат. 1429 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №700 1989 г. *4 кат. 657 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 89 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 10 Е8903013 дв. 8854534 1989 г. *3 кат. 1512 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №717 1989 г. *4 кат. 893 ч* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 50 000 | 5 000 |
| 90 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375 №05596 1982 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 380474 дв. 688668 1982 г. *3 кат. 1000 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 5 500 | 550 |
| 91 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375 №02327 1981 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 367543 дв. 359066 1981 г. *3 кат. 1134 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 5 500 | 550 |
| 92 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375 №06393 1982 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 380726 дв. 690800 1982 г. *3 кат. 1014 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 5 500 | 550 |
| 93 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375 №04335 1982 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 376317 дв. 644964 1982 г. *3 кат. 1011 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 5 500 | 550 |
| 94 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375 №08041 1981 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 359650 дв. 479711 1981 г. *3 кат. 1559 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 5 500 | 550 |
| 95 | Грузовой Урал-4320-ОМ-0710 ш. 100788 дв. 279950 1988 г. *4 кат 98 953 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 5 500 | 550 |
| 96 | Грузовой Урал-4320-0011 ш. 059390 дв. 631337 1986 г. *5 кат 48 418 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 6 000 | 600 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **15 июня 2017 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 12 июня 2017 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **15 июня 2017 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701,ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by**

---

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВА №9752136 **считать недействительным**.

УНП 100122726

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

| Наименование (назначение), общая площадь, инвентарный номер, адрес расположения | Составные части и принадлежности |
|---|---|
| **Лот №1** | |
| **Здание цеха №4** (здание специализированное иного назначения), 4043,2 кв. м, 240/С-40713, г. Орша, ул. Селицкого, 2/1 | Здание цеха №4 |
| | Автомобильные дороги |
| | Наружная канализация |
| | Наружный водопровод |
| | Кабельная линия |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,7965 га предоставлен продавцу для обслуживания здания цеха №4 на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 414 535 руб. 61 коп.** | |
| **Лот №2** | |
| **Центральный растворный пункт** (здание неустановленного назначения), 202,9 кв. м, 240/С-43224, г. Орша, пер. Заводской 2-й, 23Б | Центральный растворный пункт |
| | Насосная станция ППТ |
| | Сход* |
| | Емкости |
| | Наружная канализация |
| | Благоустройство |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,3222 га предоставлен продавцу для обслуживания здания центрального растворного пункта на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 41 527 руб. 04 коп.** (снижена на 50%) | |
| **Лот №3** | |
| **Здание склада ГСМ** (здание специализир. складов, тор. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 28,3 кв. м, 240/С-43037, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215Б | Склад ГСМ |
| | Благоустройство |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,2492 га предоставлен продавцу для обслуживания здания склада ГСМ на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 8 375 руб. 00 коп.** (снижена на 50%) | |
| **Лот №4** | |
| **Очистные сооружения** (сооружение специализир. коммунального хозяйства), 240/С-43220, г. Орша, ул. Людвига Селицкого, 2В | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0.1283 га предоставлен продавцу для обслуживания очистных сооружений на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 21 777 руб. 41 коп.** | |
| **Лот №5** | |
| **Здание материального склада** (здание специализир. складов, тор. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 1406,2 кв. м, 240/С-42936, г. Орша,ул. Владимира Ленина, 215Ж | Здание материального склада |
| | Наружная канализация |
| | Производствен. автомоб. дороги |
| | Кабельная линия (низковольтная) |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,7922 га предоставлен продавцу для обслуживания здания материального склада на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 111 169 руб. 50 коп.** (снижена на 50%) | |
| **Лот №6** | |
| **Здание стройгруппы** (здание специализир. для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), 574,7 кв. м, 240/С-42940, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215В | Здание строй группы |
| | Наружная канализация |
| | Производственные дороги |
| | Кабельная линия (низковольтная) |
| | Забор вокруг территории завода |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,3123 га предоставлен продавцу для обслуживания здания строй группы на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 54 919 руб. 34 коп.** (снижена на 50%) | |
| **Лот №7** | |
| **Склад запчастей** (здание специализир. складов, тор. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 1669,9 кв. м, 240/С-42939, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215Д | Склад запчастей |
| | Наружная канализация |
| | Производственные дороги |
| | Кабельная линия (низковольтная) |
| | Забор вокруг территории завода |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,3880 га предоставлен продавцу для обслуживания здания склада зап. частей на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 139 472 руб. 40 коп.** (снижена на 50%) | |
| **Лот №8** | |
| **Здание склада** (здание специализир. складов, тор. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 62,1 кв. м, 240/С-42996, г. Орша, ул. Людвига Селицкого, 2Б | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,0886 га предоставлен продавцу для обслуживания склада на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 9 244 руб. 10 коп.** | |
| Лот №9 | |
| **Здание столовой** (здание специализир. для общественного питания), 1778 кв. м, 240/С-28818, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215А | Здание столовой |
| | Наружная канализация |
| | Наружный водопровод |
| | Кабельная линия низковольтная |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,1256 га предоставлен продавцу для обслуживания здания столовой на праве постоянного пользования. Ограничения прав на зем. участок: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения пл. 0,0031 га | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 535 460 руб. 21 коп.** | |

**Обременения**: частичная аренда. Подробности на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Задаток 1%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010, в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после снятия продавцом в установленном законодательством порядке всех зарегистрированных ограничений (обременений)

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 24.03.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 17.05.2017 в 11. 00** по адресу:
**г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 15.05.2017 до 17.00** по указанному адресу.
**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

Считать недействительным страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта» серии BY/12 №15138534

---

ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает участие в закупке №2017 – 445398, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по процедуре оформления конкурентного листа на закупку работ по разработке, вводу в эксплуатацию и внедрению программного обеспечения автоматизированной системы бухгалтерского учета ЗАСО «Промтрансинвест» на базе платформы «1С: Предприятие 8», интегрированной с действующей автоматизированной информационной системой (АИС) «Certus». Тел. (17) 228 14 28.

УНН 100357923

---

Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВА №9751892 **считать недействительным.**

УНП 100122726

---

19.04.2017 участниками СООО «ЗИКО», ООО «Новая параллель» и ООО «СтелсЦентр» принято решение о реорганизации в форме присоединения ООО «Новая параллель» и ООО «СтелсЦентр» к СООО «ЗИКО».

УНП 100006896

---

## Государственное предприятие «СтройМедиаПроект»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБОРУДОВАНИЯ

| | |
|---|---|
| **Проведение аукциона** | |
| **Дата проведения аукциона** | 06.06.2017 |
| **Время** | 14.00 |
| **Место проведения** | г. Минск, ул. В. Хоружей, 13/61, 3-й этаж, к. 302 |
| **Организатор аукциона** | |
| **Наименование, местонахождение** | Государственное предприятие «СтройМедиаПроект», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 13/61, УНП 100299864, ОКПО 24949925000 |
| **Контактное лицо** | Заместитель директора Семижён Степан Валентинович |
| **Телефоны** | 8 (017) 288 60 93, 8 (044) 775 68 32 |
| | |
| **Лот №1** | Резальная машина К-525-11, 1982 г.в. |
| **Начальная цена продажи** | 270,46 бел. руб. с НДС |
| **Лот №2** | Копировальная рама 26-IKS, 2001 г.в. |
| **Начальная цена продажи** | 408,93 бел. руб. с НДС |
| **Лот №3** | Копировальная рама SacK-19, 2007 г.в. |
| **Начальная цена продажи** | 382,55 бел. руб. с НДС |
| **Лот №4** | Копировальная рама CT640/2MH2 РФ, 2003 г.в. |
| **Начальная цена продажи** | 1 211,14 бел. руб. с НДС |
| **Размер задатка** | 10% от начальной цены продажи лота |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012600000081 в филиале №510 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, ул. Куйбышева, 18, код 153001603, УНП 100299864, ОКПО 24949925000, получатель платежа – государственное предприятие «СтройМедиаПроект». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества государственным предприятием «СтройМедиаПроект» (Лот №__), проводимого 06.06.2017 |
| **Прием заявлений** | По 05.06.2017 до 16.00 в рабочие дни с 9.30 до 12.30, с 14.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 13/61, 3-й этаж, к. 302 |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Продавец** | Государственное предприятие «СтройМедиаПроект» |
| **Условия аукциона** | Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Лот №1 и (или) Лот №2 и т.д. до Лота №4 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Лота №1 и (или) Лота №2 и т.д. до Лота №4 в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота (Лотов) в течение 20 (двадцати) календарных дней с момента заключении договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителями аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

Организатор аукциона вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Автомобиль MERCEDES-BENZ ATEGO 1222L, год выпуска – 2012, цвет: черный, VIN №WDB9702551 L684077 стоимостью 81 476,75 руб. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧТУП «ВитКаскадСтрой» (УНН 390497664) |
| **Наличие обременений** | Декрет Президента Республики Беларусь №6 от 07.05.2012 г. |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. С. Панковой, 3 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 17.05.2017 в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by). Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610421, (8033) 6879148 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 часов 16.05.2017 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

SEX-БАЛЯСЫ

# А ВОСЬ — ХРЭН!

**Ці любіце вы гэты прадукт так, як люблю яго я? Не ў тым сэнсе, што аўтар такі фанат хрэну, зусім не. Але пад халадзец — самае тое. Многім жа ён не падабаецца, падаецца вельмі пякучым ці злым. Ну што ж, бывае. Брат неяк нават процівагаз мусіў надзець, каб здзерці карані. («Мне часам падаецца, што людзі, якія п'юць гарбату і каву без цукру, могуць са спакойным выразам твару забіць некалькі чалавек і застацца абыякавымі».) У Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю пэўны час таму паступіла петыцыя ад грамадзян, якія заклікалі забараніць аднаму вытворцу выпуск гэтага прадукту, маўляў, апошні трэба гатаваць у хатніх умовах, бо ён нашмат смачнейшы і карыснейшы за казённы.**

Хоць, па шчырасці, не многія гараджане кідаюцца дапамагаць з агародамі вясковым сваякам. Некаторых туды ні за якія пернікі папрацаваць не заманіш. («— Сынок, прыязджай да нас на дачу. — Не хачу. — Дарэмна. Тут піва, дзяўчаты. Прыгажосць! — Тата, я не куплюся на гэта другі раз! Капайце самі сваю бульбу!») Галоўнай прычынай звароту грамадзян у міністэрства была рэклама таго хрэну, на погляд заяўнікаў, — эратычная. Ну, вы ж бачылі яе?

Міністэрства, з аднаго боку, прызнала слушнасць думкі тых, хто падпісаў зварот. У прыватнасці, што спалучэнне візуальнай і тэкставай інфармацыі стварае двухсэнсоўнасць, накіроўваючы ўспрыманне рэкламы на зусім іншы кантэкст... Прызнаюся, што двухсэнсоўнасць, гульня слоў — любімая забаўка аўтара. («Калі мы з мужам ходзім па крамах і ён кажа мне «заплачу», я ўважліва ўглядаюся ў яго твар, спрабуючы здагадацца, куды ў гэтым слове ён ставіць націск».) Гэта я да таго, што эротыка і павінна быць крышку «востранькай»... З іншага боку, міністэрства адказала заяўнікам, што да адказнасці нікога прыцягваць не будзе. Маўляў, «сюжэты не з'яўляюцца рэкламай, калі выкарыстоўваліся ў якасці ілюстрацый да журналісцкіх матэрыялаў на тэму рэкламы». («— Пазнаёмцеся, гэта мой новы хлопец! — А дзе папярэдні? — Не дакажаце!») Выходзіць, калегі па цэху падмаглі такім чынам вытворцу. Дарэчы, у журналісцкіх матэрыялах таксама павінна быць вастрыня... («Хрэн багаты не толькі на вітамін С, але і на разнастайныя асацыяцыі».)



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

А што ўжо ў жыцці хапае сюжэтаў з пярчынкай, з разраду «любоўь зла»! Напрыклад, кітайскі 31-гадовы інжынер... «ажаніўся» з самаробным робатам. Пісалі, што ён пацярпеў фіяска ў пошуках рэальнай жонкі, таму і пайшоў на такі крок. Упёрся, можна сказаць, як змог — насуперак абставінам. Робата-дзяўчыну мужчына стварыў год таму і даў ёй імя. «Нявеста» ўмее распазнаваць вывы, іерогліфы і ведае некалькі слоў. (Памятаеце анекдот з нагоды? «Да жанчыны яго мары яна не дамаўчала ўсяго нічога».) На «вяселле» «жаніх» пазваў родных і сяброў. Па кітайскай традыцыі «нявесту» апранулі ў чорны касцюм і чырвоную хустку. У будучым інжынер хоча ўдасканаліць машыну, каб наваспечаная «жонка» магла самастойна хадзіць і дапамагаць па доме. («Палюбоўніц заводзяць слабыя мужыкі. Моцныя мужыкі заводзяць жыгулі пры мінус сорак».)

Што ў пэўным сэнсе даказаў нядаўна наш суайчыннік з Верхнядзвінскага раёна. Праўда, у гэтай сітуацыі было не мінус, а плюс сорак, прычым, у ім самім. Мужчына нападпітку зайшоў на мясцовую малочнатаварную ферму і ўбачыў там трактар з ключом у замку запальвання. І што, па вашаму, ён зрабіў? («Наш народ звычайна не мае плана дзеянняў. Ён страшны сваёй імправізацыяй».) Правільна, накіраваўся на суседнюю ферму да сваёй сужыцелькі. Па словах згоншчыка, яму вельмі хацелася прызнацца жанчыне ў каханні. («У жыцці трэба быць непрадказальным і каварным. Як агурок з горкай попкай»).

Ці вось вам яшчэ адзін нядаўні падобны сюжэт з жыцця ў тэму. Тут, праўда, галоўнай фігуранткай выступае жанчына. У Брэсце таксіст вёз п'яную кліентку, а тая ў выніку... украла яго аўтамабіль. («— Як жа хочацца весялосці, віна, вар'яцкага сексу! Дзяўчаты, выклікайце таксі! — Каця, ты моцна пераацэньваеш таксістаў...») У жанчыны не хапіла грошай, каб расплаціцца, і кіроўца павёз яе ў міліцыю. Ага, ведаў бы ён, з кім мае справу! («Калі ты моцная, смелая, лоўкая і вельмі сексуальная, ідзі дадому, ты п'яная».) Па дарозе кліентка ўчыніла скандал: выкінула ў акно мабільнік таксіста і таксометр. Калі той спыніўся, каб сабраць маёмасць, жанчына перасела за руль машыны і паехала. Праўда, тут жа трапіла ў ДТЗ. У абодвух выпадках фігурантаў спраў чакае крымінальная адказнасць. Трэба было думаць...

Вось неяк даўно мая будучая жонка ў якісьці момант чамусьці передумала ёй станавіцца і з'ехала да маці. Я сеў, пачухаў патыліцу, падумаў... Ну, вы здагадаліся, пра штосьці... («Будзьце рэалістамі — патрабуйце немагчымага».) Сеў у таксі, паехаў і забраў яе назад.

...Вы, мабыць, чулі гэтую студэнцкую байку? Неяк у інтэрнаце ў пакой да нашага хлопца зайшоў у госці замежнік, які жыў тут жа. Вядома, па правілах гасціннасці таго трэба было нечым пачаставаць. Як на бяду, у беларуса — ані крошкі. Але студэнт не разгубіўся: паставіў на стол слоік з хрэнам. «І не кажы потым, што ў мяне нічога не было!» Так што без хрэну — ніяк. Ён у мяне ў халадзільніку заўсёды ёсць. Адпаведна, і за жартам у кішэню лезці не даводзіцца...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Невыканальных заданняў няма»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Спадабалася адразу?***

— Так, спачатку спрабавала сябе на АНТ, потым перайшла ў мастацкую дырэкцыю на СТБ, дзе рыхтавала сюжэты для ранішняй праграмы. Пазней супрацоўніцтва прапанаваў тэлеканал «Беларусь 5», але пагадзілася я толькі праз два гады, бо разумела, што быць проста вядучай не хачу. «Галава, якая гаворыць» — гэта, вядома, цікава, але мне хацелася чагосьці большага, таму доўгі час проста здымала рэпартажы і тым самымназапашвала вопыт. А потым неяк сяджу і пасылаю ў космас думку, што мне яшчэ якая-небудзь работа не зашкодзіла б. Вельмі хацелася паспрабаваць штосьці новае. Не паверыце, праз хвілін дзесяць прыходзіць паведамленне: «Маша, ці не хочаш яшчэ раз паспрабаваць сябе ў якасці вядучай?» Адказ быў відавочны.




***— Памятаеце свой першы зняты сюжэт?***

— Так, калі я толькі прыйшла працаваць на СТБ, у мяне спыталі: «Ты ўжо здымала сюжэты?» Я разумею, што калі скажу — не, то ніякага сюжэта мне не відаць. Таму адказала, што здымала, хоць, гэта, вядома, было не так. Першая мая тэма — «Далёкія падарожжы на аўтамабілі». Нічога не ведаючы пра гэта, я зрабіла, як потым аказалася, нядрэнны сюжэт.

***— Зараз працуеце са спартыўнай тэматыкай. Ніколі не сутыкаліся са стэрэатыпам, што дзяўчына не можа добра разбірацца ў такіх мужчынскіх відах спорту, як хакей і аўтаспорт?***

— Не, мне заўсёды шанцавала на людзей. Калі запрасілі ў праграму «Піт-стоп», не магу сказаць, што добра разбіралася ў аўтаспорце. Але я ў сябе верыла, людзі ў мяне верылі, паступова за ўсім разбіралася і працавала. Я лічу, што няма невыканальных заданняў, перад кожнымі здымкамі проста неабходна рыхтавацца. Пераглядаю ўсю стужку навін, цалкам спрабую паглыбіцца ў тэму. Не сорамна чагосьці не ведаць, сорамна не цікавіцца.

***— Навіны вы ведзяце ў прамым эфіры, а ў ім ад нечаканасцяў застрахавацца немагчыма...***

— Я заўсёды трохі хвалююся, таму што не ведаю, як можа павесці сябе тэхніка, ну і чалавечы фактар, вядома ж, прысутнічае. У адзін з рабочых дзён у мяне вельмі моцна балела горла, нос быў закладзены, тэмпература і самае страшнае, што я ўвесь дзень чхала. І як вы думаеце, чаго я баялася больш за ўсё? Вядома, чхнуць у эфіры. Мне здаецца, што ўсе мае думкі былі засяроджаны на адным: каб толькі не апырскаць камеру бактэрыямі *(смяецца)*.

***— Марыя Багатыр на экране і па-за ім — гэта розныя людзі?***

— Не, абсалютна аднолькавыя. Я заўсёды вельмі эмацыянальная і жыццярадасная, бо лічу сябе вельмі шчаслівым чалавекам. І галоўнае маё шчасце заключаецца ў тым, што я хачу быць шчаслівай. Для мяне працуе такая методыка: нават калі ты сумны, стомлены, напружаны — прымусь сябе ўсміхнуцца. Мышцы, якія ўдзельнічаюць у гэтым працэсе, пасылаюць у мозг сігнал і арганізм пачынае выпрацоўваць эндарфін.

***— Работу прадстаўнікоў найперш публічных прафесій заўсёды ацэньваюць. Як ставіцеся да каментарыяў у свой адрас?***

— Я іх не чытаю. Гляджу на сваіх знаёмых, якія ў той ці іншай ступені звязаны з медыйнай сферай, і бачу іх перажыванні з гэтай нагоды. Негатыўныя каментарыі могуць раніць да глыбіні душы, а мне хочацца, каб вакол быў пазітыў. Дарэчы, яшчэ таму я вельмі хутка развітваюся з людзьмі. Калі мне аднойчы здрадзілі, падманулі, зрабілі нейкую подласць, усё роўна, калькі я кантактую з гэтым чалавекам, развітваюся імгненна.

***— Вы ўжо паспелі пабываць і замужам...***

— Так, была такая гісторыя ў маім жыцці, і яна аказалася нядоўгай. Я не такі чалавек, каб шкадаваць пра штосьці, таму разглядаю сваё замужжа, як адно са звёнаў ланцужка, які ў выніку прывёў мяне да таго, што я маю сёння.

***— Зараз вы хаваеце сваё асабістае?***

— Так, я проста шчаслівая, навошта камусьці штосьці расказваць або паказваць. Нават у сацыяльных сетках агульных здымкаў з маім мужчынам няма. У мяне там наогул вельмі мала асабістага. Не бачу ў гэтым сэнсу.

***— Што вы больш за ўсё цэніце ў мужчыне?***

— Розум, пачуццё гумару і самае галоўнае — прыстойнасць. Заўсёды і пры любых абставінах трэба заставацца прыстойным чалавекам.

***— Кожны дзень на вас глядзяць тысячы людзей, як падтрымліваеце сябе ў выдатнай форме?***

— Галоўны сакрэт — добры настрой і сон. Вельмі добрыя лекі для маіх мышцаў — танцы, магу пабегаць і патрэніравацца ў трэнажорнай зале. Што тычыцца догляду за тварам, не выкарыстоўваю асаблівых масак ці працэдур, мне яшчэ не так шмат гадоў *(смяецца)*.

***— Аб чым вы марыце?***

— Скажу шчыра, заўсёды загадваю адно і тое ж жаданне, Новы год гэта ці падаючая зорка. Хачу, каб я ніколі не страціла ўменне быць шчаслівай, каб у любых, нават самых цёмных тунэлях, знаходзіла тое самае святло. Таму што ўсё астатняе, дакладна ведаю, я змагу.



**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 03.05.2017 г.

УНП 500523227

# ОАО «СЛОНИММЕБЕЛЬ»




*231800, Беларусь, Гродзенская вобл.,
г. Слонім, вул. Гандлёвая, 9*



Малады спецыяліст, намеснік начальніка канструктарска-тэхналагічнага аддзела Віталь Іванавіч ЖЫЛІНСКІ



На нарадзе ў бухгалтэрыі: бухгалтары Марына Аляксандраўна МАРКУШЭЎСКАЯ і Іна Міхайлаўна ВОЎЧАК, галоўны бухгалтар Валянціна Уладзіміраўна ЖАРЫКАВА, бухгалтары Тацццяна Пятроўна ФЕДАСЮК і Наталля Іосіфаўна НОВІК



Мастак роспісу па дрэве Павел Уладзіміравіч ДЭШКА



Станочнік дрэваапрацоўчых станкоў Мурат Рынатавіч ВАГАПАЎ



Абіўшчыкі мэблі Вячаслаў Іванавіч ЦУПРЫК, Уладзімір Іванавіч НАЗАРАНКА і Дзмітрый Уладзіміравіч ПЛАУХ



Слесар-рамонтнік аддзела галоўнага механіка Уладзімір Пятровіч ЖОДЗЬ і слесар па рамонце і абслугоўванні сістэм вентыляцыі Аляксандр Андрэевіч МАЦЯЮК



Аддзелачнікі вырабаў з драўніны Алена Сцяпанаўна БО́РСУК, Валянціна Аляксандраўна ШЭСТАК, Ганна Уладзіміраўна КАЗАК, Жанна Іванаўна РАПНІЦКАЯ



Трактарыст Аляксандр Мікалаевіч ПЯТЛІЦКІ і вадзіцель пагрузчыка Мікалай Фёдаравіч ПЯКАРСКІ



Аператар станкоў з праграмным кіраваннем Сяргей Аляксандравіч ГРЫБ



У сталовай прадпрыемства: кухары Алена Сямёнаўна ЛЯШЭВІЧ і Марыя Мікалаеўна ФРЭЛІК



Сталяры зборачнага цэха Вячаслаў Уладзіміравіч ЧУГУНОЎ і Вадзім Яўгенавіч МАКЕРАЎ

Матэрыял падрыхтаваў Ігар КАЗЛОЎ.
Фота Кацярыны ЯНУШЭВІЧ.

# МАДЭРНІЗАЦЫЯ Ў КІТАІ ВАЧЫМА БЕЛАРУСКАГА ПАЛІТОЛАГА

**Кітайская тэма ўсё больш займае розум вучоных, даследчыкаў у Беларусі. І прадметам вывучэння становяцца не толькі беларуска-кітайскія адносіны ў розных галінах дзейнасці. Гісторыкі, палітолагі, эканамісты, філосафы імкнуцца зразумець, як, за кошт якіх рэсурсаў Паднябесная і яе народ змаглі дасягнуць такіх неверагодных поспехаў. Як змаглі адолець многія палітычныя супярэчнасці і вырвацца далёка наперад. Пра Кітай, пра тое, чым яго вопыт можа быць карысным для Беларусі, — наша размова з палітолагам, кандыдатам гістарычных навук Віктарам ГЕРМЕНЧУКОМ.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет ваша кніга «Кітай. Крылы Дракона». Што падштурхнула для даследавання такога характару? Пра Кітай жа ўжо столькі напісана...***

— Сапраўды, шмат і вельмі шмат напісана. Ды не заўсёды добра, грунтоўна. Асабліва па праблемах палітычнай мадэрнізацыі краіны. Якраз пра гэта і расказвае мая кніга. Візітоўка большасці даследаванняў пра стары і новы Кітай — неразгаданыя таямніцы Усходу.

У сілу гістарычных абставін сваёй «бліскучай ізаляцыі» гэтая краіна стала добра вядомай еўрапейцам толькі ў XVII—XVIII стагоддзях. Захапленне выклікала літаральна ўсё: амаль 5 тысяч гадоў гэтай найстаражытнейшай на зямлі цывілізацыі, велізарная тэрыторыя і колькасць насельніцтва, яе багацці, вышляхтаваная кітайская культура, якая не можа не прываблівацъ, не дарыць новыя мастацкія сюжэты. Тады — у час адкрыцця, пазнання — нікому і ў галаву не прыходзіла лічыць Кітай адсталай дзяржавай. Кітайская эканоміка выпрацоўвала ў гэты час прыкладна 30 працэнтаў сусветнага валавога прадукту. Амаль ні ў чым краіна не саступала іншым дзяржавам у тэхналагічных і арганізацыйных адносінах. А ў палітычным плане Кітай нават пераўзыходзіў еўрапейскія дзяржавы.

Як вядома, вынаходніцтва самога фармату «Захаду», заходняй цывілізацыі належыць часу эпохі Асветніцтва. Але не ўсім вядома, што адкрыты выклік асветнікаў такім «ганебным з'явам», як прывілеі царквы і каралеўскай улады, засноўваўся на спасылках якраз на гісторыю кітайскай дзяржаўнасці. Менавіта Канфуцый стаў святым анёлам-ахоўнікам эпохі Асветніцтва. А канфуцыянства было абвешчана, у адрозненне ад хрысціянства, верай розуму, верай, свабоднай ад усялякіх прымхаў, забабонаў і абсурдных легендаў. На аснове канфуцыянства больш за дзве тысячы гадоў назад была створана ўнікальная дзяржаўная машына, якая кіравала велізарнай тэрыторыяй, большай, чым сама Рымская імперыя, і падавалася адной з самых жыццядзейных палітычных сістэм, якія калі-небудзь ствараліся чалавекам. На думку Вальтэра, кітайскі палітычны рэжым з'яўляецца дэспатызмам толькі па форме. На самай справе, лічыў філосаф, гэта асветніцкая манархія з імператарам-філосафам на троне. Таму, пісаў ужо Гальбах, каб знайсці народ шчаслівым, дзякуючы ўстановам, у якіх палітыка цесна звязана з мараллю, дзе народ, дзяржаўны лад цалкам адпавядаюць ідэалу і заслугоўваюць перайманне еўрапейскімі ўрадамі, патрэбна накіравацца менавіта ў Кітай.

Гэта ўжо пасля ўсялякія сур'ёзныя стасункі Кітая з Захадам пачалі нагадваць хутчэй вуліцу з аднабаковым рухам. Прысвоіўшы выключна сабе права называцца ўніверсальнай цывілізацыяй, еўрапейцы настойліва заняліся распрацоўкай і распаўсюджваннем міфа пра інертны, закасцянелы і дэспатычны Усход.

**«Мадэрнізацыя ў Кітаі — гэта «вяртанне да сябе», сваіх гістарычных традыцый».**

***— І былі нават на той час тэорыі, якія сёння не дужа сур'ёзна і ўспрымаюцца...***

— Як, напрыклад, і гэтае перакананне. Узвышэнне еўрапейцаў над кітайцамі Мантэск'е тлумачыў, дарэчы, падбадзёрлівым кліматам Еўропы. Паколькі «спешчанасць людзей у цёплым клімаце заўсёды рабіла іх рабамі». Да гэтага хору «добразычліўцаў» адразу ж далучыліся Ліней, Юм, Кант і іншыя прызнаныя навуковыя аўтарытэты. Яны пераконвалі сваіх чытачоў у тым, што кітайцы, аказваецца, увогуле іншы від людзей, «жоўтыя азіяты». У адрозненне ад белай расы яны, маўляў, не здольныя да сапраўднай цывілізацыі і гістарычнай творчасці. Так, не паспеўшы нарадзіцца ў розумах асветнікаў, еўрапейская цывілізацыя стала жыць па ўласным разуменні, пачала прэтэндаваць на выключную місію.

***— Вось ужо гэтыя памкненні да «выключнасці»...***

— Энергія думкі падпітвала энергію дзеяння. Яна пераўтварала памкненне да поспеху ў базавую ўласцівасць асобы чалавека і еўрапейскага грамадства ў цэлым. Абвясціла надоўга экспансію і каланіялізм у якасці асноўнага прынцыпу і метаду цывілізацыйнага лідарства. Параўнальная сусветная гісторыя, непасрэдны кантакт старажытнай кітайскай і маладой еўрапейскай цывілізацый закончыўся «трыумфам сучаснасці» ў Еўропе і Амерыцы і «эпохай прыніжэння» ў Кітаі. Гэтыя дзве крайнасці цывілізацыйнага развіцця пакідаюць адкрытым пытанне пра тое, што чакае свет ва ўмовах, калі асноўныя гульцы памяняюцца месцамі. Калі Захад па-ранейшаму лічыць нармальным абыходжанне з ужо новым Кітаем як абыходжанне з дрэнным вучнем, «жоўтай пагрозай», а не з партнёрам.

***— Яшчэ на пачатку перабудовы ў Савецкім Саюзе і пасля ўжо ў суверэннай Беларусі многія палітолагі, ды і палітыкі-практыкі, азіраліся і нават сёння азіраюцца ў выбары мадэлі ўладкавання новага жыцця выключна на Захад, Амерыку... А вы неаднойчы ў сваёй працы гаворыце пра тое, што сам Захад выявіў жаданне вучыцца ва Усходу... У чым жа гэта выяўляецца? Якія мадэлі дзяржаўнага ўладкавання бярэ, з вашага пункту гледжання, на ўзбраенне Захад з вопыту Кітая ці іншых краін Паўднёва-Усходняй Азіі найперш?***

— Гісторыю заўсёды пісалі пераможцы. Аднак заходняя цывілізацыя ў сваім гаражным жаданні быць усеагульнай нормай для чалавецтва проста пераацаніла свае сілы і магчымасці. Аднолькава сумна канулі ў Лету размовы пра «місію белага чалавека», развіццё рынкавай эканомікі і дэмакратыі, вартасці глабалізацыі для народаў усіх краін. «Шукайце ісціну ў фактах», — раяць кітайцы. Ідэя «канца гісторыі», яе завяршэння ў касмапалітычную эпоху свабоднай рынкавай эканомікі і ліберальнай дэмакратыі, закончылася для Захаду і ЗША знішчальным канфузам. Так што не такі ўжо і прагматычны Захад, калі навідавоку істотная філасофска-палітычная разгубленасць...

***— Атрымліваецца, што многія тэорыі проста праваліліся?***

— Я сказаў бы крышачку інакш. Гэта нават не правал, а вялікі і сістэмны крызіс палітыкі ваяўнічага заходняга індывідуалізму і настойлівага прытрымлівання ўласных інтарэсаў. Заслужаная расплата за пастаянную экспансію, рабства, каланіялізм, рабаванне, адабраную гісторыю і будучыню ў мільярдаў людзей. Многія з іх даўно ўсумніліся ў прыродзе і прыярытэтах сучаснага капіталізму, годнасці заходняй палітычнай сістэмы.

Больш за тое, уважлівыя аналітыкі даўно звярнулі ўвагу, што заходняя цывілізацыя сама страціла веру ў прагрэс. З гэтым звязаны пастаянныя прароцтвы пра крах Захаду. Ужо для Шпенглера ў «Заняпадзе Еўропы» гісторыя ператвараецца ў працэс «з узвышанай бязмэтнасцю», калі цывілізацыі «з'яўляюцца, выспяваюць, вянуць і ніколі не паўтараюцца». Стомленасць ад уласнай гісторыі — гэта сур'ёзная хвароба, паважаныя панове. Яна вельмі небяспечная ў сваім памкненні пераправарыць ўласнае пахаванне ў паніхіду па ўсёй чалавечай цывілізацыі. Таму будучыню штурмуюць «пераможаныя». У кітайцаў ёсць для гэтага відавочныя перавагі. Яны даўно навучыліся не звяртаць увагу на ўсе агучаныя глупствы пра ўласную краіну і перспектывы сусветнага развіцця. Захад прапаноўвае шукаць «новую Айчыну» ў «змене арыенціраў». А мадэрнізацыя ў Кітаі разглядаецца як «вяртанне да сябе». Таму «няхай мерцвякі самі хаваюць сваіх мерцвякоў», а не блытаюцца пад нагамі ў жывых, якія поўныя сілы і амбіцый. Новы Кітай з самага пачатку ніякім чынам і не збіраўся паўтараць вопыт Захаду і кіравацца яго парадамі.

**«Захад шукае «новую Айчыну» ў «змене арыенціраў».**

Поспехі мадэрнізацыі Кітая і іншых краін Паўднёва-Усходняй Азіі можна патлумачыць толькі гэтымі перакананнямі. Пачынаючы пад'ём да вышынь росту і развіцця, «азіяцкія тыгры» стварылі на базе традыцыйных канфуцыянскіх каштоўнасцяў тып «разумнай дзяржавы». Яе стрыжнем з'яўляецца своеасаблівая грамадская дамова паміж урадам і кіруемым насельніцтвам адносна мэт развіцця, пераадолення эканамічнай адсталасці, беднасці і няроўнасці.

Гэта забяспечыла актыўную падтрымку рэформаў, сацыяльны мір і палітычную стабільнасць. Значэнне гэтых фактараў для паспяховага развіцця лепей за ўсіх разумеюць якраз тыя ўрады, дзе гэтыя ўмовы адсутнічаюць. Незадаволенасць і абурэнне грамадзян нездольнасцю сваіх кіраўнікоў забяспечваць эканамічны рост і паляпшаць сітуацыю з сацыяльнай роўнасцю перакуліла многія палітычныя рэжымы і пахавалі самыя амбіцыйныя планы рэформаў. Гэта стала прычынай шматлікіх крызісаў лідарства, імпічментаў, канстытуцыйных і ваенных пераваротаў, з'яўлення значнай колькасці дзяржаў, якія не адбыліся.

***— Вы збіраецеся працягваць свае даследчыцкія работы па кітайскай тэматыцы?***

— А я і не спыняўся, нягледзячы на тое, што кніга была напісана і рыхтавалася да друку. Мяне вельмі цікавіць фармат уяўленняў пра Кітай у астатнім свеце. Бачу, што вельмі часта грамадская думка кіруецца стэрэатыпамі. Вось і стараюся іх абвяргаць. Сённяшняя рэчаіснасць у Кітаі — унікальны матэрыял для філасофскіх і паліталагічных разваг.

**Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

■ Погляд

# АДКУЛЬ ТАКІ СПРЫТ?



**На сусветнай арэне адбываецца цікавая трансфармацыя. Той самы Дональд Трамп, які не адчуваў ніякай цікавасці да знешняй палітыкі ЗША і ішоў на выбары з велізарнай праграмай рэформаў у сферы эканомікі, пачынае нашмат больш актыўна займацца знешняй палітыкай, чым эканомікай. Пра самыя цікавыя моманты ніжэй.**

Нанесены ракетны ўдар па сірыйскім аэрадроме, нібыта ў адплату за выкарыстанне хімічнай зброі, якое прыпісваецца гэтай краіне, але на самай справе, каб падчас перамоў уразіць старшыню КНР Сі Цзіньпіна сваёй непахіснасцю і магутнымі ракетамі. Тое, што на гэта не было атрымана дазволу Савета бяспекі ААН, Трампа не спыніла, як не спыняе ізраільцян і Турцыю.

Складваецца адчуванне, што ў КНДР надышлі сапраўды цяжкія часы. Укараненне сістэмы супрацьракетнай абароны ў Паўднёвай Карэі сумесна з ЗША, нягледзячы на актыўныя пратэсты Кітая, стала толькі першым крокам. У заявах Трампа дамінуе ваяўнічая рыторыка, ваенна-марскія злучэнні перадыслацыруюцца да берагоў КНДР, вашынгтонскія аналітыкі агучваюць магчымыя сцэнарыі ваенных дзеянняў супраць краіны.

Самая буйная амерыканская няядзерная бомба ўпершыню падарвана на тэрыторыі Афганістана. Але ж падземныя збудаванні былі там у талібаў і раней.

Думаецца, галоўная прычына ў тым, што крокі Трампа на ўнутранай арэне паспяхова блакіруюцца яго сапернікамі. Першай няўдачай стаў крах спроб Белага дома не дапусціць у краіну падазроных грамадзян з буйных ісламскіх краін з дапамогай судовай сістэмы. Былі зроблены дзве спробы і абедзве праваліліся. Для Трампа гэта вынік, які вельмі расчароўвае.

Не лепшая сітуацыя складваецца ў сферы рэформы аховы здароўя. Гэта быў адзін з найважнейшых пунктаў перадвыбарчай праграмы новага прэзідэнта. 24 сакавіка Дональд Трамп адклікаў з Кангрэса новы законапраект па рэформе аховы здароўя, які павінен быў прыйсці на змену сістэме медыцынскага страхавання Obamacare. Прычына банальная — нягледзячы на дамінаванне рэспубліканскай партыі ў парламенце, прыхільнікі законапраекта з ліку членаў рэспубліканскай партыі не змаглі набраць дастатковую колькасць галасоў для яго прахаджэння.

Вялікім расчараваннем стала і праходжанне каманды Трампа праз Кангрэс. І навошта пасля такіх праблем мець партыйную большасць?

Кучу непрыемнасцяў прынеслі і пастаянныя абвінавачванні саветнікаў Трампа ў рабоце на Расію.

У выніку становіцца зразумела, чаму прэзідэнт, які падчас перадвыбарчай гонкі пазбягаў знешнепалітычнай тэматыкі, які дзесяцігоддзямі займаўся бізнесам у Амерыцы, марыў усё перарабіць так, як яму падабаецца, раптам так актыўна заняўся міжнароднымі адносінамі. Трамп вельмі самалюбівы чалавек. Ён не прывык да пастаянных расчараванняў, яму вельмі важны ўласны імідж паспяховага прэзідэнта. Дональд Трамп выявіў, што кардынальныя рэформы ўнутры ЗША справа вельмі няпростая для амерыканскага лідара, у якога складаныя адносіны з уласнай партыяй, не кажучы ўжо пра апанентаў. Тыя ўсё не могуць дараваць Трампу перамогу на выбарах меншасцю з перавагай на карысць Хілары Клінтан у тры мільёны выбаршчыкаў. Трамп — сапраўды лідар, абраны меншасцю выбаршчыкаў, хоць і не вінаваты ў гэтым, бо такія нюансы састарэлай выбарчай сістэмы ЗША.

Ну, а калі рэформы ўнутры ЗША суправаджаюцца пастаяннымі расчараваннямі, Дональд Трамп заняўся знешняй палітыкай. Ён выявіў, што тут у амерыканскага прэзідэнта вельмі вялікія паўнамоцтвы, мінімальна абмежаваныя іншымі галінамі ўлады. Аддаў загад аб запуску крылатых ракет па Сірыі — яны адразу ж узляцелі ў паветра, і ніякі амерыканскі суддзя не зможа вярнуць іх на месца базіравання. А Кангрэсу можна паведаміць аб прынятым важным рашэнні ў знешняй палітыцы ўжо пастфактум.

У выніку рызыка ў прыняцці знешнепалітычных рашэнняў з боку Дональда Трампа, якая палохае шмат каго, ёсць лагічны вынік яго нездольнасці рэалізаваць уласную праграму рэформаў з-за празмерных перашкод з боку апанентаў і негатыўнасці ўвесь час цярпець расчараванні новага вельмі самалюбнага амерыканскага лідара. Але такія рысы характару не найлепшая камбінацыя для знешняй палітыкі самай узброенай дзяржавы на планеце, якой з'яўляюцца ЗША. Трамп сапраўды не вельмі кампетэнтны ў сферы знешняй палітыкі і не ведае, што большасць праблем у гэтай сферы нельга вырашыць ужываннем зброі або пагрозамі яе выкарыстання. Таму маюць рацыю тыя, хто кажа, што ў выніку бяспека ў свеце знаходзіцца пад пагрозай. Застаецца толькі спадзявацца, што сітуацыя ва ўнутранай палітыцы ЗША зменіцца, Трамп атрымае больш магчымасцяў для правядзення сваіх эканамічных рэформаў, і аслабне яго ўвага да ідэі набыць сабе лаўры ў сферы знешняй палітыкі з дапамогай агрэсіўных паводзін.

**Сяргей КІЗІМА**

■

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №400/С-78079 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе), площадью 515,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 4 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000001007129 (назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного для общественного питания (кафе)), площадью 0,0984, расположенный по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 4. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0984 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код 13,2, площадью 0,0130 га |
| **Начальная цена продажи** | 174 000 р. (сто семьдесят четыре тысячи рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 17 400 р. (семнадцать тысяч четыреста рублей) |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 18 мая 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.11.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 12 мая 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

*http://grodnoino.by/*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №422/С-974 (назначение – здание нежилое, наименование – кухня-столовая), площадью 1223,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425850100004000066, площадью 0,2172 га (назначение – содержание и обслуживание здания кухни-столовой) по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3 |
| **Начальная цена продажи** | 145 511,04 р. (сто сорок пять тысяч пятьсот одиннадцать рублей четыре копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 7 275 р. (семь тысяч двести семьдесят пять рублей) |
| **Продавец** | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 25 мая 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 01.10.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 19 мая 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32**

*http://grodnoino.by/*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. №422/С-42213 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – здание лечебного корпуса (больница)), площадью 405,6 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А;<br>- капитальное строение, инв. №422/С-12977 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – амбулатория), площадью 86,4 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Бершты, ул. Центральная, 27А;<br>- капитальное строение, инв. №422/С-12974 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – овощехранилище), площадью 8,2 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А, корп. 1;<br>- капитальное строение, инв. №422/С-12975 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – гараж), площадью 53,3 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А, корп. 2;<br>- капитальное строение, инв. №422/С-12976 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – хозяйственный корпус), площадью 207,9 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А, корп. 3 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | - кадастровый номер 425884800405000035, площадью 0,3270 га (назначение – для обслуживания зданий и зданий больницы) по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0365 га; земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,3270 га;<br>- кадастровый номер 425884800405000034, площадью 0,0433 га (назначение – для эксплуатации и обслуживания здания амбулатории) по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Бершты, ул. Центральная, 27А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0433 га |
| **Начальная цена продажи** | 31 468,62 р. (тридцать одна тысяча четыреста шестьдесят восемь рублей шестьдесят две копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 573 р. (одна тысяча пятьсот семьдесят три рубля) |
| **Продавец** | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 25 мая 2017 г. в 12.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.10.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 19 мая 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32**

*http://grodnoino.by/*

# ИЗВЕЩЕНИЕ

**Мотыкальский сельский исполнительный комитет Брестского района (организатор аукциона) извещает о проведении 6 июня 2017 года открытого аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № лота | Местоположение земельного участка и кадастровый номер земельного участка | Характеристика участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации и регистрацию земельного участка (руб.) | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская обл, Брестский р-н, аг. Большие Мотыкалы, ул. Луговая, 4 №121283001601000784 | Земельный участок площадью 0,1108 га. Земельный участок на всей площади имеет ограничения в использовании на мелиорируемых землях и на площади 0,0017 га в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт | 0,1108 | 10000 | 1000 | 1418,51 руб. + ( возмещение расходов на объявления в СМИ о проведении аукциона согласно акту выполненных работ) | строительство и обслуживание жилого дома |

**Аукцион будет проводиться 06.04.2017 г. в 10.00 по адресу: Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома)**

Для участия в аукционе гражданин со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 31 мая 2017 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6, документы:**

в аукционе участвуют граждане Республики Беларусь, которые предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь;

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона (1000,00 белорусских рублей 00 копеек на расчетный счет Мотыкальского сельисполкома, №3641000000275 в филиал №100 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест, код 246, с назначением платежа «Задаток за земельный участок», с отметкой банка о его исполнении.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Конт. телефоны: **(8-0162) 949-135, (8-029) 761-92-84.**

Аукцион проводиться при наличии не менее двух участников. Аукцион проводиться в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. №462.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной 5%, обязан:

- подписать протокол в день проведения аукциона;

- в течение 10 рабочих дней со дня принятия утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок на счет ГУ МФ РБ по Брестской области бюджет Мотыкальского сельисполкома, №3600213060057 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 795, назначение платежа 04901, УНП 200676206;

- возместить затраты на организацию и проведения аукциона, в том числе расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения на расчетный счет ГУ МФ РБ по Брестской области бюджет Мотыкальского сельисполкома, №3600213060057 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, код 795, назначение платежа 04616, УНН 200676206;

- приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома, но не позднее одного года с момента государственной регистрации права частной собственности на земельный участок, также возмещает затраты на строительство, проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к данному земельному участку, согласно Постановлению Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. №298

# Запінкі, макі і «Аліса ў краіне цудаў» на розных мовах

## НЕЗВЫЧАЙНЫЯ КАЛЕКЦЫІ БЕЛАРУСАЎ

**Рэкардсменаў сабраў сайт Kufar. Усяго заяўку на ўдзел падало больш за 100 чалавек з захапленнямі, якія выклікаюць здзіўленне і шчырую зацікаўленасць. Афіцыйна «самымі-самымі ў Беларусі» былі прызнаны 30 дасягненняў.**


Фота Надзеі БУЖАН.
За некалькі гадоў калекцыянерам-пачаткоўцам — сям'і Газізавых — удалося адшукаць 25 выданняў «Алісы ў краіне цудаў» на розных мовах.

Бізнесмен з Мінска **Давід ЧЫТАЯ** за 10 гадоў сабраў калекцыю, у якой **512 пар запінак**. А пачалося ўсё з кур'ёзу: маладога чалавека запрасілі на вяселле, той з нагоды ўрачыстага выпадку купіў кашулю, прыйшоў дадому, а на ёй не хапае гузікаў. Вярнуўся, каб разабрацца з нядобрасумленным прадаўцом, а аказалася, што ніякага браку няма — гэта кашуля адмысловая, пад запінкі. На вяселлі, дзякуючы цікаваму аксесуару, Давід атрымаў, мабыць, больш кампліментаў, чым маладыя. Пасля таго выпадку запінкі сталі неад'емнай часткай вобраза.


Любімая пара запінак бізнесмена Давіда Чытая сімвалізуе Уол-стрыт.

Спачатку збіраў усё, у тым ліку і простыя, потым перайшоў на больш мудрагелістыя ўзоры. Галоўная ўмова, каб яны былі новымі: калекцыянер не хоча пераймаць чужую энергетыку. Для важных сустрэч Давід заўсёды выбірае пару, якая сімвалізуе Уол-стрыт: бык і мядзведзь. Самымі дарагімі па значнасці мужчына лічыць запінкі, у якіх ажаніўся: яны выкананы ў выглядзе жаніха і нявесты. Гэты асобнік калекцыі ўжо стаў своеасаблівым шчаслівым талісманам: многія сябры Давіда пазычалі іх на свае ўласныя вяселлі.

Наогул фантазія майстроў амаль бязмежная. Так, у калекцыі ёсць запінкі ў выглядзе рулеткі, у сярэдзіне якой круціцца малюсенькі шарык. Ці ж у форме канверта, цалкам прыдатнага для захоўвання мініяцюрнага ліста. А пры дапамозе запінак-трубак нават можна па-сапраўднаму курыць. Розныя звяры і казуркі, прадукты, маркі машын, віды спорту... Давід расказаў, што дома ў яго ёсць спецыяльныя стэлажы для захоўвання калекцыі. Часам, у залежнасці ад настрою, бізнесмен змяняе запінкі па некалькі разоў на дзень, таму, прызнаецца, ужо паспеў перанасіць усе пары.

У журналісткі і блогера **Асі ПАПЛАЎСКАЙ** — іншы запал. Дзяўчына збірае **прадметы з макамі**, іх колькасць ужо перавышае **150 асобнікаў**. «Першынцам» сталі завушніцы з палімернай гліны, якія ўлюбілі ў сябе будучую калекцыянерку з першага погляду падчас адпачынку ў Кактэбелі. Далей — больш: свечкі, посуд, нататнікі, заколкі, брошкі, адзенне... На мінулы дзень нараджэння Ася нават зладзіла макавую вечарыну. Журналістка адзначае, што жывыя кветкі захоўваюць свежасць у вазе ўсяго на некалькі гадзін, а вельмі хочацца зберагчы іх цудоўную прыгажосць даўжэй. У планах у дзяўчыны — адбіць гэту кветку ў сябе на целе, а пасля арганізаваць прафесійную фотасесію на макавым полі.

Самай юнай калекцыянеркай прызнана **трохгадовая** мінчанка **Аліса**. Яна з'яўляецца ўладальніцай найбольш буйнога ў краіне збору кніг Льюіса Кэрала **«Аліса ў краіне цудаў»**, прычым на розных мовах. За некалькі гадоў удалося адшукаць **25 выданняў**. З ранняга ўзросту дзяўчынка падарожнічала разам з бацькамі. І вось у Галандыі ім прыйшла ў галаву думка, што нядрэнна было б набыць «мясцовую» версію знакамітай кнігі, якая, дарэчы, перакладзена больш чым на 150 моў свету. Пасля гэтага з усіх паездак замест магнічікаў сям'я пачала прывозіць такі незвычайны сувенір, а хутка да справы падключыліся і іх блізкія і знаёмыя. Сама Аліса больш за ўсё любіць асобнікі з маляўнічымі ілюстрацыямі, бацькі ж з нецярпеннем чакаюць выхаду кнігі на беларускай мове.

Акрамя гэтага, сярод рэкордаў — самая вялікая рок-бібліятэка, калекцыя грамафонаў і патэфонаў, гальштукаў-бабачак, эксклюзіўнай мужчынскай біжутэрыі. Аднак сярод рэкордаў прадстаўлены не толькі калекцыі. Так, малады пісьменнік **Кірыл СТАСЕЛЬКА** быў адзначаны як аўтар **рамана з самай вялікай колькасцю герояў**. Іх у творы 136, так што новы персанаж з'яўляецца амаль на кожнай старонцы. Каманда, у якую ўваходзяць **Казімір, Сашок і Mamy Gummy**, атрымала ўзнагароду як **самае сталае трыа дыджэяў**. Агульны ўзрост удзельнікаў — 212 гадоў. Трое разьбяроў з Беразіно прадставілі **самую вялікую драўляную лыжку** ў свеце. Гэта дасягненне таксама было зафіксавана Кнігай рэкордаў Гінеса. Даўжыня прыбора-гіганта — **23 метры**. Лыжка высечана з суцэльнага ствала дуба, майстры працавалі над ёй больш за паўгода.

У спіс трапілі і іншыя архітэктурныя і прыродныя аб'екты, напрыклад, самы глыбокі бункер — 45 метраў — знаходзіцца на беларуска-польскай мяжы. Найстарэйшай школай прызнана слуцкая гімназія №1: навучальная ўстанова хутка адзначыць 400-гадовы юбілей. Самы доўгі ў Беларусі дом на 26 пад'ездаў і амаль 1000 кватэр можна ўбачыць па адрасе — горад Мінск, вуліца Ясеніна, 6, а вось найбольш старажытны дуб, які па праве называюць Царом, расце ў Маларыцкім раёне. Старажылу каля 800 гадоў, яго вышыня складае 46 метраў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*


У калекцыі Ігара Барысевіча — фанографы, грамафоны, патэфоны і грампласцінкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.27 | 20.46 | 15.19 |
| Віцебск — | 5.12 | 20.41 | 15.29 |
| Магілёў — | 5.17 | 20.37 | 15.20 |
| Гомель — | 5.20 | 20.27 | 15.07 |
| Гродна — | 5.43 | 21.01 | 15.18 |
| Брэст — | 5.50 | 20.56 | 15.06 |

### Месяц

*Першая квадра 3 мая.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксея, Дзяніса, Ісака, Кандрата, Мікалая, Фёдара.*
***К.** Антаніны, Монікі, Міхала, Палікарпа, Роберта, Рыгора.*


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Вы зусім такі худзенькі... Што вы ясце?
— Тое што і вы, толькі на паўвядра менш.

**Як быць жанчынай:**
**1. Знаходзіш сабе хлопца, у якога ўсё добра.**
**2. Назаўжды сціраеш усмешку з яго самазадаволенага твару.**

Абед у інтэрнэт-аддзеле:
— У каго ёсць нож? Я ўзяла зыходнікі для салаты.

— Іра, гэта называецца «гародніна».

**Яна сказала, што купіла гэтую карункавую бялізну спецыяльна для мяне, а потым пакрыўдзілася, калі я яе апрануў.**

З раніцы ў мяне было настолькі моцнае пахмелле, што я прачнуўся пад душам амаль гадзіну.
Потым я набраўся сіл і ўключыў яго.



Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

## Даты Падзеі Людзі

### 4 МАЯ

**1527** год — 490 гадоў з часу нараджэння Канстанціна Астрожскага, палітычнага і культурнага дзеяча Беларусі. Меў вялікі ўплыў у ВКЛ. Выступаў супраць распаўсюджвання каталіцтва ў Беларусі і на Украіне, падтрымліваў праваслаўныя брацтвы, заснаваў школы ў Слуцку, Тураве, Уладзіміры-Валынскім, у Астрогу — школу і друкарню, у якой працаваў Іван Фёдараў. Памёр у 1608 годзе.

**1772** год — нарадзіўся Фрыдрых Арнольд Бракгаўз, нямецкі выдавец, заснавальнік энцыклапедычнага выдавецтва, якое носіць яго імя.

**1878** год — Томас Эдысан упершыню публічна прадэманстраваў вынайдзены ім фанограф. Гэты апарат быў папярэднікам грамафона, патэфона і наогул прылад гуказапісу і гукаўзнаўлення. Імпульсам для стварэння Эдысанам фанографа стала жаданне зарэгістраваць тэлефонныя размовы ў сваёй лабараторыі. Першыя запісы ўяўлялі сабой паглыбленні на паверхні фольгі, зробленыя іголкай, якая рухалася. Фольга размяшчалася на цыліндры, які круціўся пры прайграванні гуку. Кошт усёй прылады склаў 18 долараў. З дапамогай такой тэхнікі ўдалося запісаць словы з дзіцячай песенькі «У Мэры быў баранчык». Прагназуючы практычнае прымяненне свайго вынаходства, Эдысан меркаваў, што прыбор будзе выкарыстоўвацца для запісу «апошніх жаданняў джэнтльменаў перад смерцю».



**1890** год — нарадзіўся (в. Сенцяняты, цяпер у Смаргонскім раёне) Алесь Ляжневіч, беларускі тэатральны дзеяч, драматург. У 1911—1914 гадах — удзельнік Беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні. З 1920-га — у Мінску, акцёр БДТ-1, у 1921 годзе яго дырэктар. Пазней працаваў у Ленінградзе на кінастудыі «Савецкая Беларусь». Аўтар кнігі «Сялянскі тэатр», героіка-рэвалюцыйнай драмы «З дымам-пажарам». Зрабіў інсцэніроўку паэмы М. Чарота «Босыя на вогнішчы». У 1937 годзе арыштаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957-м.

**1982** год — удзельнікі першай савецкай гімалайскай экспедыцыі Уладзімір Балыбердзін і Эдуард Мыслоўскі здзейснілі ўнікальнае ў гісторыі сусветнага альпінізму ўзыходжанне на найвышэйшую вяршыню свету — гару Эверэст — і ўстанавілі там Дзяржаўны сцяг СССР.

### Было сказана

**Уладзімір ЛІПСКІ, пісьменнік:**
*«Жыццё — дар Божы. Даражы жыццём, чалавек. Апраўдаеш дар — будзеш адораны вечнасцю».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1610.
Нумар падпісаны ў 19.30 3 мая 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12